ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дарожным дадаткам „Прафух")
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок пошп. пасьля тэксту—50 к., іншаземных абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавкі.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

СУБОТА, 19 ліпеня 1930 г.
№ 166 (3764)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Ліквідаваць прарывы ў выкананьні прамфінпляну

Буйнейшыя посьпехі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва, у прыватнасьці ў справе ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну народнае гаспадаркі, тлумачацца выключна правільнай палітыкай і кіраўніцтвам камуністычнай партыі. Палітыка партыі заўсёды апіралася і апіраецца на найвялікшы працоўны ўздым і творчы энтузіязм найшырэйшых мас рабочае клясы.

Толькі дзякуючы гэтаму можна вытлумачыць масавы пераход пралетарыяту Савецкага Саюзу да новых сацыялістычных форм арганізацыі працы, да вышукваньня новых вышэйшых форм сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Права-апартуністычным тэарэтыкам, усім іх пасьлядоўнам, усім тым, каму пяцігодка здавалася бязглуздай фантазіяй, награжаючай рознымі небясьпекамі—рабочая кляса, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, процінаставіць нябачныя тэмпы, гіганцкі размах сацыялістычнага будаўніцтва, перамагаючы дзікасьці багацейшай творчай ініцыятывай. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва на шляху свайго разьвіцьця ўсё больш і больш удасканальваюцца, прымаюць новыя вышэйшыя формы. Іменна сацспаборніцтва адыграла рашаючую ролю ў перавыкананьні плянаў першых 2-х год пяцігодкі.

Праваапартуністыя «двухгодка», аграрызацыя краю, як і тэорыя «арганізаванага капіталізму!, на сёньняшні дзень, **калі сацыялістычная прамысловасьць умацавала сваю вядучую ролю ва ўсёй народнай гаспадарцы краю**—канчаткова пабіты.

Улічваючы посьпехі першага году пяцігодкі, бягучы гаспадарчы год (як другі год пяцігодкі), асабліва апошняга яго кварталу, зьяўляецца годам, калі трэба напружыць усе сілы, ўсю энэргію ня толькі на выкананьне, але і перавыкананьне кантрольных лічбаў нашага пяцігадовага пляну.

Асаблівую ўвагу мы павінны зьвярнуць на ліквідацыю тых прарываў, якія бязумоўна могуць і павінны быць ліквідаваны.

Рад галін прамысловасьці БССР як, напрыклад, **гарбарная, галянтарэйная, папяровая, фанэрная, цагляная, *) на працягу 8-мі месяцаў другога году пяцігодкі** свае вытворчыя пляны **не давыканалі на 4,2 проц.** Прамфінплян па **торфараспрацоўках** знаходзіцца **пад яўнай пагрозай зрыву. Капітальнае будаўніцтва** ўсіх гэтых галін прамысловасьці **разгортваецца недапушчальна марудна.**

У **часьці зьніжэньня сабекошту** мы маем у радзе галін прамысловасьці таксама адмоўныя паказчыкі. Замест **прадугледжаных плянамі 11 проц. зьніжэньня сабекошту,** гэты процант **ледзь-ледзь даходзіць да 7.**

У сувязі з недавыкананьнем праграм, некаторыя прадпрыемствы гонячыся за колькасьцю—жадаючы да канца месяца прысьці са здавальняючым колькасным паказьнікам, нішчаць якасьці, не зважаючы на паляпшэньне якасьці прадукцыі. Якасьць на гэтых прадпрыемствах ня толькі не паляпшаецца, але, **наадварот рэзка пагаршаецца. Процант браку ўзрастае.** Ёсьць прадпрыемствы, дзе брак **вырас да 8 проц.** усёй выпускаемай прадукцыі, замест вызначаных **плянам 4,5—5 проц.** («Энэргія», Дняпроўская м-ра).

На радзе прадпрыемстваў назіраецца **поўная адсутнасьць пляннавасьці, рад няўвязак паміж цэхамі і асобнымі прадпрыемствамі, непаладкі з забесьпячэньнем сырцом, вельмі нездавальняючае тэхнічнае кіраўніцтва, надзвычай павольнае ўвядзеньне адзінаначальня,** косасьць, непаваротлівасьць.

Такім чынам, рад прадпрыемстваў беларускай прамысловасьці да канца другога году пяцігодкі ідуць з прарывамі **на трох галоўнейшых пунктах** выкананьня пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва, гэта: **недавыкананьне прамфінплянаў, рэзкае пагаршэньне якасьці прадукцыі і высокі сабекошт.**

Тав. **Куйбышаў на XVI зьезьдзе УсеКП(б),** у сваім дакладзе, гаварыў: **«Перад намі стаяць вялізарныя задачы, нам прадстаяць яшчэ буйныя баі за пераможнае сканчэньне гаспадарчага году. Адрэзак часу, які застаўся патрабуе асаблівай увагу да пытаньняў якасьці і зьніжэньня сабекошту. Правільная ленінская лінія Цэнтральнага Камітэту і вытворчы энтузіязм рабочых мас даюць упэўненасьць у тым, што ня толькі гэты год мы скончым з посьпехам, але і выканаем пяцігодку за чатыры гады».**

Прарывы тлумачацца пераважна тым, што некаторыя нашы гаспадарнікі і прафарганізацыі ня могуць і ня хочуць **рашуча адкінуць старыя мэтады сваёй работы.** Яны ўпарта не **жадаюць** перабудоўвацца **на новыя, бальшавіцкія тэмпы.**

Мы маем шмат фактаў, калі **творчы энтузіязм і творчая ініцыятыва шырокіх рабочых мас, аб якіх гаварыў тав. Куйбышаў,** нашымі гаспадарнікамі і прафсаюзамі на радзе прадпрыемстваў **не накіроўваюцца ў адпаведнае рачышча,** і заўкомшчыкі абсалютна не разумеюць **вельмі невыстарчальна скарыстоўваюцца.** Гаспадарнікі і прафарганізацыі ў многіх мясцох яшчэ на сёньняшні дзень не падумалі аб прыстасаваньні на сваіх прадпрыемствах новых вышэйшых форм сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Мы маем поўнае права сказаць, што яны ніякага ўяўленьня ня маюць аб тым, што такое **«сквозная» ўдарная брыгада», «грамадзкі буксір», «апэрацыйна-плянавыя групы»** і г. д. Ня гледзячы на тое, што на старонках газэт гэтаму пытаньню аддаецца вельмі многа ўвагі, ня гледзячы на тое, што **да новых формаў сацспаборніцтва прыкавана ўся ўвага пралетарскай грамадзкасьці,** нашы прафарганізацыі на мясцох чамусьці не займаюцца вынучэньнем яго і ўкараненьнем яго на сваім прадпрыемстве. Больш таго, **ужо калі 1 з пал. месяцаў прайшло** з таго часу, як прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў **ўліць у рады барацьбітоў за пераходны сьцяг УсеЦСПС рад прадпрыемстваў,** але да сёньняшняга дня ні самы прадпрыемствы ні адпаведныя прафарганізацыі нічым на гэту пастанову не адказалі. Некаторыя дырэктары усяго значэньня і капітоўнасьці сацспаборніцтва—і ўдарніцтва, бо на папрокі ў павольнасьці ўкараненьня сацспаборніцтва і на сваіх прадпрыемствах, яны адказваюць, тым, **што «зэраз нам няма часу»,** «мы займаемся ліквідацыяй прарываў», або «мы зараз заняты пераходам на 7-гадзінны рабочы дзень». (Завод «Камунар», швейная фабрыка і г. д.). У той-жа час не жадаюць зразумець, **што ўкараненьне і шырэйшае скарыстаньне сацспаборніцтва значна паскорыць ліквідацыю прарываў і нават пераход на 7-гадзінны рабочы дзень.**

Ня ўмешваючыся жорстка Таваганьне на ліквідацыі трох трох галоўнейшых прарываў. **Усю ўвагу—на якасьць прадукцыі і зьніжэньне сабекошту. Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ўсіх відаў трэба накіраваць ня толькі па лініі колькаснага выкананьня, але і на палепшаньне якасьці. Трэба неадкладна мабілізаваць усе ўнутрывытворчыя рэсурсы, зьвярнуць узмоцненую ўвагу на рэалізацыю рабочых прапаноў, рашуча адкінуць інтэртнасьць, коснасьць і бюракратызм. Камандныя вышыні нашай прамысловасьці адразу-ж павінны перабудавацца на новыя бальшавіцкія тэмпы будаўніцтва.**

Пастановы XVI зьезду УсеКП(б) па пытаньнях наступленьня па ўсім фронце сацыялістычнага будаўніцтва павінны быць даведзены да шырокіх колаў рабочых мас. Пяцігодка за чатыры гады павінна быць выканана.

*) Гл. загад т. Грысэвіча па ВСНГБ.

„Рашаючае значэньне... у даны момант атрымлівае... праблема арганізацыі працы ў калгасах, разьмеркаваньне ўраджаю ўнутры калгасу"

(З рэзалюцыі XVI партзьезду па справаздачы ЦК УсеКП(б)

Кожны калгасьнік павінен ведаць парадак разьмеркаваньня ўраджаю і іншых прыбыткаў у калгасе

„Прасачыць, каб пытаньні разьмеркаваньня ўраджаю вырашаліся не за сьпіной калгасьнікаў, у якой-небудзь канцылярыі, а на падставе дырэктыў ЦК партыі самімі калгасьнікамі агульным сходам калгасьнікаў, з зацьверджаньня агульнага сходу калгасьнікаў" (Якаўлеў, на XVI зьезьдзе)

Ліст праўленьням калгасаў, усім раённым і акркалгассаюзам

Разьмеркаваньне ўраджаю і прыбыткаў у калгасах складае ў цяперашні час адну з галоўнейшых задач калгаснага будаўніцтва. Пытаньне гэта ня можа быць укладзена ў адну якую-небудзь форму, аднолькава прыгодную для ўсіх калгасаў, маючых свае асаблівасьці як па ступені абагуленьня сродкаў вытворчасьці, так і эканамічнай моцнасьці.

Усе калгасьнікі павінны ведаць, што вынікі іх гаспадарчай дзейнасьці і працы ў калектыўнай гаспадарцы — усе прыбыткі і ўраджай калгасу знаходзяцца ў поўным распараджэньні саміх калгасьнікаў. Разьмеркаваньне ўраджаю і прыбыткаў павінна забясьпечыць далейшае разьвіцьцё калектыўнае гаспадаркі і палепшыць матар'яльнае і культурнае становішча калгасьнікаў. Адначасова разьмеркаваньне ўраджаю і прыбыткаў павінна спрыяць падняцьцю прадукцыйнасьці працы, узмацненьню працдысцыпліны, скарыстаньню актыўнасьці калгасьнікаў у справе замацаваньня і далейшага разьвіцьця калгаснага будаўніцтва.

Для таго, каб правільна разьмеркаваць ураджай і прыбыткі, кожны калгас павінен на падставе прынятага статуту, маючыхся пастаноў ураду па даным пытаньні і з улікам усіх мясцовых асаблівасьцяй, абмеркаваць і вырашыць на агульным сходзе калгасаў пытаньне аб разьмеркаваньні ўраджаю і прыбыткаў калгасу, кіруючыся наступнымі прыкладнымі правіламі:

1) Для таго, каб правільна разьмеркаваць ураджай і прыбыткі калгасу перш за ўсё трэба правільна падлічыць усе прыбыткі і выдаткі калектыўнае гаспадаркі.

Неабходна, каб да пачатку разьмяшчэньня ўраджаю і прыбыткаў калгасу ўсе справаздачныя дакументы як па ўсіх прыбытках, так і па выдатках былі праверены рэвізійнай камісіяй калгасу і справаздача праўленьня з заключэньнем рэв. камісіі была-б зацьверджана агульным сходам калгасу.

2) Пасьля падлічэньня і зацьвярджэньня ўраджаю і прыбыткаў калгасу робяцца адлічэньні ў 5-процантны фонд для разьмяшчэньня паміж калгасьнікамі адведнага маемасьці, унесенай кожным з іх у абагулены фонд калгасу. Гэты 5-процантны фонд вылічваецца з валавога ўраджаю арцелі і прыбытку ад велы.

Увага: Прыбыткі ад кароў, набытых калгасам на рахунак крэдытаў, ці іншых сродкаў калгасу, а таксама ад канфіскаваных кулацкіх кароў і кулацкія пасевы, якія залічаны ў непадзельныя фонды, ня прымаюцца ў рахунак пры разьмеркаваньні адзначаных 5 проц.

3) Пасьля гэтага з ураджаю і прыбыткаў калгасу адлічваецца насенны фонд, кармавы фонд для абагуленай жывёлы, выдаткі па с.-г. падатку і страхаваньні калгаснай маемасьці, а таксама выдаткі на адміністрацыйна-гаспадарчыя патрэбы і на пагашэньне крэдытаў, паводле дадзеных калгасамі абавязацельстваў на гэты год.

Увага: 1. Пры складаньні абагуленных фондаў трэба ўлічваць выстарчальнае забесьпячэньне кормам і подсьцілам для абагуленай жывёлы ў працягу году, а таксама і тае жывёлы, якую мэркуецца набыць у 1930—31 годзе.

2. Крэдыты, якія пайшлі ў капітальныя ўкладаньні гаспадаркі, пагашаюцца ў першую чаргу за рахунак адлічэньняў у непадзельныя фонды.

4) Непадзельны капітал складаецца ў разьмеры ня звыш 10 проц., а іншыя грамадзкія фонды ў разьмеры ня звыш 5 проц. з атрыманага калгасам ураджаю і прыбытку пасьля адлічэньня ў насенны фонд, кармавы фонд для абагуленай жывёлы, выдаткаў па аплаце с.-г. падатку і страхаваньня калгаснай маемасьці.

Увага 1. Выдаткі па аказаньні дапамогі непрацаздольным членам калгасу, а таксама часова страціўшым працаздольнасьць, выдаткі па культурным абслугоўваньні калгасьнікаў, паляпшэньні добрабыту і інш. уваходзяць у лік паказаных грамадзкіх фондаў у разьмеры ня звыш 5 проц.

2. Старыя калгасы, найбольш гаспадарча моцныя, адлічэньні ў непадзельныя капіталы могуць праводзіць паводле статуту, г. зн. у непадзельны фонд адлічваецца ад 10 да 30 проц. і ў іншыя грамадзкія ад 5 да 15 проц.

5) Пасьля стварэньня паказаных адлічэньняў у непадзельны капітал, у грамадзкія фонды і 5 проц. у фонд для разьмеркаваньня паміж калгасьнікамі адведнае маемасьці, унесенай кожным калгасьнікам, а таксама пасьля стварэньня насеннага і кармавога фонду і адлічэньня па с.-г. падатку і страхаваньні, на пагашэньне крэдытаў, адміністрацыйна-гаспадарчыя выдаткі і г. д. прыбыткі калгасу, атрыманыя ад рэалізацыі ўраджаю і розных іншых крыніц падзяляюцца паміж членамі калгасу, паклаўшы ў аснову разьмеркаваньня колькасьць і якасьць працы, затрачанай кожным калгасьнікам на работах у калгасе.

Аднак, прымаючы пад увагу, што ў гэтым годзе не ва ўсіх калгасах наладжаны ўлік працы і што пры насыщы на работу не заўсёды ўлічваліся патрэбы шматлюдных гаспадарак, можна ў паасобных выпадках, па пастанове агульных сходаў калгасьнікаў, дапускаць разьмеркаваньне па сямях ня

Увага: Пры выдачы калгасьнікам прадуктаў і грошай у капчатковы разрахунак вылічваецца раней атрыманыя калгасьнікамі авансам прадукты, фураж і грошы.

6) Капчатковае разьмеркаваньне прыбыткаў паміж членамі калгасу праводзіцца ў канцы гаспадарчага году. Аднак, рэкамандуецца пасьля ўборкі і абмалоту ўраджаю праводзіць разьмеркаваньне атрыманых прадуктаў у рахунак капчатковага разьліку, не чакаючы канца справаздачнага году. Пры гэтым трэба прытрымлівацца наступнага прыкладнага правіла:

1. Увесь ураджай калгасу знаходзіцца ў поўным распараджэньні калгасьнікаў і падзяляецца паміж імі адведнасьцю і якасьцю працы, затрачанай калгасьнікам у калектыўнай гаспадарцы.

2. Пры падлічэньні ўраджаю збожжавых і фуражных культур для выдачы натурай калгасьнікам, праўленьне калгасу і агульны сход калгасьнікаў павінны ўлічваць:

а) абавязацельствы калгасу па здачы (продажу) таварнага збожжа падрыхтоўчым органам у разьмеры ня звыш $^{1}/_{8}$ часткі валавога збору збожжа;

б) адсыпаць патрэбную колькасьць пасеньня ў насенны фонд для пасеву усёй калгаснай плошчы ў 1930—31 годзе;

в) забясьпечыць зварот натурай насеннай пазыкі, згодна маючыхся ў калгасе абавязацельстваў на гэты год;

г) забясьпечыць зернафуражом абагуленую жывёлу калгасу і тую жывёлу, якая будзе набыта ў 1930—31 годзе.

3. Пры разьмеркаваньні паасобных культур, якія выдаюцца натурай членам калгасу, неабходна ўлічваць патрэбы як абагуленай гаспадаркі, так і паасобных калгасьнікаў у сэнсе забесьпячэньня іх неабходнымі спажывецкімі культурамі і фуражом для абагуленай жывёлы і птушак.

Звыш паказаных у гэтай інструкцыі адлічэньняў, ніякіх іншых адлічэньняў не дапушчаць.

Тэрмінова на агульных сходах калгасьнікаў растлумачыць гэту інструкцыю.

7) Ураджай азімых культур, засеяных мінулай восенью членамі, с.-г. арцелі ў індывідуальным парадку, а таксама і яравых культур, засеяных у індывідуальным парадку тымі калгасьнікамі, якія ўступілі ў калгас пасьля веснавой пасеўнай кампаніі 1930 году, належыць засеўшчыкам і знаходзіцца ў іх поўным распараджэньні. Пры абмалоце гэтых культур, засеяных у аднаначным парадку, частка сабранага збожжа прадаецца засеўшчыкамі нарыхтоўчым органам, згодна дагавароў па кантрактацыі, калі такія заключаны, частка ідзе ў насенны фонд арцелі, згодна асобнай інструкцыі НКЗ і Белкалгасцэнтру, а таксама на аплату калектыўнай уборкі і абмалоту. Ніякіх іншых адлічэньняў у фонды калгасу не праводзіцца.

Ва ўзбуйненых калгасах азімы пасеў, утвораны да ўзбуйненьня калгасу, на [illegible] сталым калгасьнікам, зрабіўшым пасевы да ўваходу ў калгас, добраахвотна згаджаюцца іх абагуліць, разьмеркаваньне ўраджаю азімых і яравых культур утвараецца на агульных падставах.

8) Гэтыя правілы ў асноўным адносяцца да сельска-гаспадарчых арцеляй.

Правілы і парадак разьмеркаваньня прыбыткаў і натуральнай часткі ўраджаю ў таварыствах па супольнай апрацоўцы зямлі і камунах устанаўляюцца на агульным сходзе членаў т-за і камун у дакладнай адпаведнасьці з іх статутам.

Наркамзем БССР **РАЧЫЦКІ**
Чам. Старшыні Праўленьня
Белкалгасцэнтру **СТРЭЛЕ.**



Выезд на жніво ў калгасе «Пралетары». (Меншчына).

ПАКЛАСЬЦІ КАНЕЦ ІГНАРАВАНЬНЮ ПРАСЬЦЕЙШЫХ ВІДАЎ С.-Г. КААПЭРАЦЫІ

Недаацэнка значэньня прасьцейшых відаў вытворчых каапэрацыйных аб'яднаньняў прывяла да амаль поўнага іх развалу на Беларусі. У пэрыяд «головокружения от успехов» сельска-гаспадарчая каапэрацыя ня толькі спыніла работу па арганізацыі новых нізавых аб'яднаньняў, але і зусім не зьвяртае ніякай увагі на іх налічную сетку. Вынікі такога ігнараваньня ў наўнасьці—на 1-га мая па БССР налічвалася ўсяго 130 паляводчых таварыстваў, 273 малочных і 10 садова-агародных. Зусім аказалася ліквідаванай сетка мэліярацыйных аб'яднаньняў, закліканых адыграць на Беларусі вельмі важную ролю. І гэта ў той час, калі ў кастрычніку мінулага году сетка с.-г. каапэрацыі складалася з 748 паляводчых таварыстваў, 407 малочных, 125 садова-агародных і 1.094 мэліярацыйных. Прасьцейшыя аб'яднаньні ахватвалі 73.000 сялянскіх гаспадарак, [illegible] 16 проц. бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак, якія не знаходзяцца ў калгасах; таварыць пра тое, што і пасьля нізрыяду адліву нічога ня зроблена для аднаўленьня і далейшага папярэньня сеткі прасьцейшых аб'яднаньняў. Даныя на 1-га чэрвеня ніякіх зьмен таксама ня унесьлі. Нічога, між іншым, ня робіцца, каб стварыць паляводныя таварыствы спэцыяльных напрамкаў—ільнаводныя, тарфяныя і г. д.

Вязьдзейнасьць с.-г. каапэрацыі працягваецца, ня гледзячы на катэгарычную настанову СНК БССР разгарнуць арганізацыю вытворчых аб'яднаньняў з такім разьлікам, каб да канца бягучага году імі было ахоплена ня менш 85 проц. індывідуальных бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак.

Трэба адзначыць, што разгортваньне нізавой сеткі с.-г. каапэрацыі сустракае рад труднасьцяй, якія ствараюцца некаторымі арганізацыямі. Няма ў гэтай справе і садзейнасьці з боку зямельных органаў. Цікавы факт—выявілася, што абслугоўваньне і стварэньне вытворчых таварыстваў нават ня ўведзена ў пляны зямельных органаў. Крэдытным плянам Белкалгасбанку не прадугледжана крэдытаваньне вытворчых аб'яднаньняў.

Дагэтуль яшчэ не ўрэгулявана пытаньне аб перадачы крэдытным таварыствам часткі сялянскіх паёў нізавым вытворчым аб'яднаньням. Белкалгасбанк нічога не ўжывае, каб выправіць гэта пытаньне, спасылаючыся на дэфіцытнасьць многіх крэдытных таварыстваў. У выніку, нават існуючыя вытворчыя аб'яднаньні нічога ня робяць, бо ня маюць сродкаў.

Зарэгістраваны рад выпадкаў, калі калгасы ня хочуць зварачаць малочным таварыствам забраны ў іх інвэнтар, або заплаціць за гэты інвэнтар грашыма. Гэта ненармальнасьць тлумачыцца тым, што ні Калгасцэнтр, ні Малкывсаюз Беларусі дагэтуль ніяк не зьбяруцца даць выразную ўстаноўку ў гэтым пытаньні. Затрыманьне ў вырашэньні гэтых спрэчак моцна адбіваецца на работе малочным таварыствам.

Ніякоў і сераднякоў-сялян, разьвіцьце якой зьяўляецца адной з важнейшых умоў паступовага пераходу да калгасу. Зьезд лічыць груба няправільнай, меўшую месца ў радзе раёнаў слабага калгаснага руху, фактычную ліквідацыю нізавых форм прасьцейшай каапэрацыйнай арганізацыі (пасялковыя таварыствы і спэцыяльныя вытворча-збытавыя таварыствы) і прапануе ўсім арганізацыям неаклада забясьпечыць аднаўленьне і далейшы рост каапэрацыйнай арганізацыі, аказваючы ёй адпаведнае арганізацыйнае і фінансавае падтрыманьне».

Гэта пастанова зьезду мае асобнае значэньне для Беларусі, у калгасы якой пакуль упягнута толькі каля 12 проц. бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак. Беларуская с.-г. каапэрацыя павінна зараз-жа пабаявому распачаць выкананьне пастановы зьезду аб прасьцейшых вытворчых аб'яднаньнях. Далейшая бязьдзейнасьць у гэтай галіне ня можа быць цярпіма. Трэба таксама ліквідаваць ненармальнасьці і тормазы, якія перашкаджаюць разгортваньню сеткі і разьвіцьцю яе работы.

Л. Н.

„Ня было ні аднаго выпадку, каб СССР ня выканаў сваіх абавязацельстваў"

Ангельскія прамыслоўцы—за разьвіцьцё гандлю з СССР

ЛЁНДАН, 17. На сьнеданьні, наладжаным «Брыцыцш Рашыан Газэт» пры сутнічала 400 гасьцей, у тым ліку поўпрад СССР у Англіі тав. **Сакольнікаў,** гандлёвы прадстаўнік СССР у Англіі тав. **Брон,** начальнік дэпартаменту па замежным гандлі Англіі **Джыльпет,** відныя ангельскія прамыслоўцы і г. д.

(«Рашыан Брыцыцш Газэт» — штомесячнік, які выдаецца былым старшынёю асацыяцыі брытанскіх прамыслоўцаў **Тальботам,** часопіс друкуецца на ангельскай і расійскай мовах і вядзе кампанію за разьвіцьцё ангельска-савецкіх гандлёвых зносін).

З прамоваю выступіў адзін з буйнейшых прадстаўнікоў сталя-ліцейнай прамысловасьці **Юзіт Бел,** які заявіў, што агульнае ангельска-савецкае паразуменьне надзвычай важна для абедзьвюх дзяржаў. Па яго думцы, у першую чаргу патрэбна давер'е. «Расія — сказаў Бел — цалкам апраўдала той крэдыт, які ёй да гэтага часу быў дадзены. **Ня было ні аднаго выпадку, каб Расія ня выканала сваіх абавязацельстваў.** Бел заявіў, што ў яго стварылася ўражаньне, што Расія з яе магчымасьцямі стане такім-жа багатым краем, як Амэрыка. Па думцы Бела, ангельска-савецкі дагавор павінен быць аснована на тым, што СССР пойдзе насустрач ў адносінах выканаьня сваіх даваенных абавязацельстваў, а Англія будзе забясьпечваць СССР капіталамі і крэдытамі ў той-жа самай форме, як і іншыя дзяржавы.

Тав. **Сокольнічаў** у сваёй прамове сказаў: «Савецкай дзяржаве часта прадяўляюць патрабаваньні ня ўмешвацца ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў. У той-жа самы час вельмі многа ўмешваюцца ва ўнутраныя справы СССР. Эканамічныя адносіны шмат выйграюць, калі прынцып няўмяшальнасьці будзе стасавацца па-сапраўднаму».

Спыніўшыся на пытаньні аб даўгах, тав. Сокальнікаў заявіў, што савецкі ўрад гатовы пацьвярдзіць і ўзяць на сябе абавязацельствы, якія ёсьць у ангельска-савецкім дагаворы з 1924 году.

Тав. Сокальнікаў паказаў далей на посьпехі, дасягнутыя ў ажыцьцяўленьні пяцігодкі, падкрэсьліў зьвязаны з гэтым рост запатрабаваньняў прамысловага абсталяваньня і г. д. і вынікаючую адсюль магчымасьць разьвіцьця сапецка-ангельскага гандлю. У выпадку прадастаўленьня нармальных камэрцыйных крэдытаў, разьвіцьцё гандлёвых адносін магло-б ісьці шпаркім тэмпам.

У заключнай частцы сваёй прамовы тав. Сакольнікаў **падкрэсьліў мірную палітыку СССР і яго рашымасьць перашкодзіць усякай спробе парушыць усеагульны мір.**

Начальнік дэпартаменту па замежным гандлі **Джыльпет** выказаў надзею на разьвіцьцё гандлю з СССР? (ТАСС).



Сталінградзкі трактарны завод.

Калгас „Кім" падае дрэнны прыклад

ГЭТЫ ЖЫВЁЛАВОДЧЫ КАЛГАС НЕ СКАРЫСТОЎВАЕ СВАЕ МАГЧЫМАСЬЦІ У ГАЛІНЕ СТВАРЭНЬНЯ КАРМАВОЙ БАЗЫ

Касьба сена ў калгасах «Батрак» і «Кім» праходзіць марудна і неарганізавана. Калгасьнікі бяз усялякага падстаў пераходзяць з адной работы на другую.

Арганізацыйна-плянавая праца ў гэтых калгасах кульгае.

Калгас «Кім» мае жывёлагадоўчы ўхіл і, такім чынам, яго задачай зьяўляецца загатаваць чым набольш кармоў. Ня гледзячы на гэта, калгас адмовіўся ўбраць сваімі сіламі лепшую частку сенажаці плошчаю ў 100 гэкт. і перадаў яе індывідуальнікам (па 10—15 га), бяз усялякага нават клясавага падыходу да гэтай перадачы.

Адмаўленьне калгасу ад такой часткі сенажаці можа быць растлумачана толькі тым, што кіраўніцтва спадохалася цяжкасьцяй уборкі, ня прыняўшы належныя меры да правільнай арганізацыі працы калгасьнікаў.

Брыгадзір «Звязды» **ЖУКАЎ**

Калгас імя 16-ці партызан падрыхтаваны

Калгас імя 16-ці партызан (Сьмілаўскі раён) поўнасьцю падрыхтаваўся да ўборкі ўраджаю і асеньняй пасеўнай кампаніі. Усе машыны як для ўборкі ўраджаю, таксама і пасеўнай кампаніі поўнасьцю адрамантаваны.

Уся рабочая сіла ўлічана і падзелена на брыгады. Брыгады абвясьцілі сябе ўдарнымі па правядзеньні ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі.

Ужо з тыдзень таму назад калгас распачаў уборку сена. Трэцяя частка сенажаці скошана.

Будаўніцтва ў калгасе ў самым разгары. Зараз распачата будаўніцтва складаў.

ЛЯВІЦКІ Ц.

Пляны да калгасу не даведзены

ХОЙНІКІ, Гомельскай акр.

Калгас «Чырвоны Араты» — узоры ў падрыхтоўцы да ўборкі. Уборка сена ў ім—на поўным ходу. З 420 гэкт. сенажаці скошана і складзена ў копы сена з 118 гэкт. Жняваркі сабраны. Складзены рабочыя брыгады.

У сучасны момант праводзіцца растлумачальная работа аб парадку падзелу ўраджаю; дзеля гэтага выкарыстоўваюцца абедзенныя перапынкі на полі. Ёсьць дзіцячыя яслі.

На жаль, райкалгассаюз яшчэ ня выслаў у калгасы агранома́ў і не даслаў сваіх плянаў. Гэта затрымлівае складаньне калгасных плянаў. Дагэтуль калгас яшчэ ня мае малатарні.

Настрой у калгасьнікаў добры. Добрыя і ўзаемаадносіны паміж імі і бяднякам-серадняцкімі індывідуальнымі гаспадаркамі.

«Чырвоны Араты» выклікае індывідуальнікаў на сацыялістычнае спаборніцтва па ўборцы ўраджаю.

Брыгадзір «Зьвязды» **ФАРБЭРАЎ.**

Жняваркі ляжаць на складах Паляводсаюзу

ЧЭРВЕНЬ. (Па тэлеграфу). Адсутнасьць жняварак пагражае зрыву ўборачнай кампаніі. З 22 патрэбных жняварак прыслана толькі 7, але і тыя ляжаць па складзе Паляводсаюзу.

Брыгадзір «Зьвязды» **ПАЛЯНСКІ.**

Напярэдадні правалу праекту Пан-Эўропы

Дзяржавы абмяркоўваюць праект Брыяна

ГРЭЦЫЯ ЛІЧЫЦЬ НЕАБХОДНЫМ УДЗЕЛ ТУРЦЫІ

АТЭНЫ. У апублікаваным сёньня адказе на мэмарандум Брыяна грэцкі ўрад заяўляе аб сваёй згодзе ўдзельнічаць у часе надыходзячай сэсіі Лігі Нацый у абмеркаваньні праекту эўрапэйскай фэдэрацыі. Грэцкі ўрад у сваім адказе пакідае за сабою права прадставіць дадаткова заўвагі па некаторых пунктах мэмарандуму, «як у інтарэсах усяе Эўропы, так і Грэцыі». У адказе выказваецца пажаданьне ўдзелу ў праектаванай фэдэрацыі Турцыі.

«Імэрысіёс Ціпос» (афіцыёз), каментуючы адказ грэцкага ўраду, заяўляе: «Грэцкі ўрад спагадна адносіцца да ўдзелу СССР і пан-Эўропе ня гледзячы на істотныя [illegible]пастайнасьці ў эканамічным рэжыме абедзьвюх дзяржаў, аднак, ня справа маленькай краіны Грэцыі ўступацца за СССР, які зьяўляецца вялікай дзяржавай.

ЛІТВА ПАТРАБУЕ ЗВАРОТУ ВІЛЬНІ

БЭРЛІН. Як паведамляе «Бэрлінэр Тагэблят», літоўскі адказ на мэмарандум Брыяна пераданы французкаму пасланьніку ў Коўне. Літоўскі ўрад выказваецца ў прынцыпе за ідэю эўрапэйскага саюзу, як яе прапануе Брыян, але ён ставіць сваю згоду на ўдзел у гэтым саюзе ў залежнасьць ад поўных агаворак. **Асноўнай умовай свайго ўдзелу Літва ставіць выпраўленьне несправядлівасьці, прычыненай ёй захопам Вільні Польшчаю.**

АНГЛІЯ НЕ СЬПЯШАЕЦЦА З АДКАЗАМ

ЛЁНДАН, 16. Відавочна, брытанскі адказ на мэмарандум Брыяна ня будзе гатовы да назначанага апошнім тэрміну. Англія памерана, як відно, абмяркоўваць пытаньне аб пан-Эўропе на сэсіі Лігі Нацый у Жэнэве адначасова з іншымі праблемамі. У Лёндане разумеюць, што хаця ў мэмарандуме Брыяна не гаворыцца аб «санкцыях», аднак, далучэньне да праектаванай ім лігі **павінна прывесьці да пацьвярджэньня артыкулу 16-га** статуту Лігі Нацый. А гэты пункт, як вядома, можа пры пэўным тлумачэньні ўцягнуць Англію ў канфлікт з ПАЗШ, бо ў выпадку вайны з Эўропай Амэрыка будзе настойваць на «свабодзе мароў». Афіцыёзны друк мала каментуе адказы іншых дзяржаў на мэмарандум Францыі, але ясна, што Англія не ўхваляе меркаваньняў аб перагляде дагавораў, выказаных у нотах Нямеччыны і Італіі.

СУПРОЦЬ КАГО І ДЛЯ ЧАГО ПАТРЭБНА ПАН-ЭЎРОПА

СТАКГОЛЬМ. Адказ нарвэскага ўраду на мэмарандум Брыяна выказвае ўпэўненасьць, што **«пан-Эўропа не прывядзе да паслабленьня Лігі Нацый і ня будзе накіравана супроць іншых краёў сьвету».** Нарвэскі ўрад мяркуе, што выканаўчы камітэт пан-Эўропы павінен складацца з членаў савету Лігі Нацый і што **задачай пан-Эўропы зьяўляецца вырашэньне эканамічных і ў асаблівасьці [illegible]ытных пытаньняў.**

ДАНІЯ АБМЯЖОЎВАЕЦЦА СПАЧУВАНЬНЕМ

СТАКГОЛЬМ, 15. Паводле паведамленьня з Капэнгагену, дацкі ўрад у сваім адказе Брыяну выяўляе свае «спачуваньне мэмарандуму», але выказваецца за прадастаўленьне эўрапэйскім дзяржавам, сталым па-за Лігай Нацый, магчымасьці прыняць удзел у перагаворах. У заключэньні дацкі ўрад заўважае, што **арганізацыя пан-Эўропы не павінна прывесьці да пашырэньня абавязацельстваў, прадугледжаных Лігай Нацый у абсягу санкцый.**

ШВЭЦКІ ЎРАД СУМНЯВАЕЦЦА

СТАКГОЛЬМ. Апублікаваны сёньня адказ швэцкага ўраду на мэмарандум Брыяна вытрыманы ў вельмі асьцярожным тоне. Швэцкі ўрад выказвае сумненьне з поводу прапановы Брыяна ўжо зараз стварыць агульна-эўрапэйскую арганізацыю з штогадовымі канфэрэнцыямі, выканаўчым камітэтам і з больш ці менш сталым сакратарыятам.

Міжнародны пралетарыят р

Галоўны агонь-направа

(Да пастаноў XVI партзьезду)

Ажыцьцяўляючы пастановы XVI партзьезду, партыя пераходзіць да дапешчага разгортаньня наступленьня сацыялізму па ўсім фронце, да ажыцьцяўленьня пяцігодкі ў чатыры гады, суцэльнай калектывізацыі Савецкага Саюзу, а на яе аснове ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Разгорнутае наступленьне сацыялізму выклікае далейшае абвастрэньне клясавага змаганьня. Капіталістычныя элементы, якія зьнішчаюцца са ўсёй распачлівасьцю, аказваюць супраціўленьне пераможнаму ходу сацыялізму.

Сацыялістычнае наступленьне не праходзіць «самацёкам», а праходзіць па шляху рашучага змаганьня з труднасьцямі. Труднасьці росту, труднасьці пабудовы сацыялізму ў адсталым краі ўскладняюцца супраціўленьнем клясавых ворагаў, якія хаваюцца за гэтымі труднасьцямі.

Але ў асновах нашага ладу, у самай сутнасьці дыктатуры пралетарыяту знаходзяцца такія невычарпальныя магчымасьці, якія ствараюць поўную магчымасьць ліквідацыі гэтых труднасьцяй, — перамогі сацыялізму.

Якая-ж асноўная ўмова скарыстаньня гэтых магчымасьцяй?

«Але каб выкарыстаць гэтыя МАГЧЫМАСЬЦІ і ператварыць іх у САПРАЎДНАСЬЦЬ, каб прыдушыць супраціўленьне клясавых ворагаў і дабіцца перамаганьня труднасьцяй, дзеля гэтага існуе толькі адзін сродак: арганізаваць НАСТУПЛЕНЬНЕ на капіталістычныя элемэнты ПА ЎСІМ ФРОНЦЕ, ізаляваць апартуністычныя элемэнты ў нашых уласных радох, якія перашкаджаюць наступленьню, якія мітусяцца ў паніцы з боку ў бок і ўносяць у партыю няўпэўненасьць у перамозе» (Сталін).

Вось якая асноўная ўмова пераможнага наступленьня сацыялізму.

Правы апартунізм у радох нашай партыі зьяўляецца асноўнай перашкодай у справе гэтага наступленьня. Правыя прапанавалі замест выкананьня пяцігодкі — «двухгодку ліквідацыі труднасьцяй», г. зн. спыненьне разьвіцьця цяжкай прамысловасьці, яны прапанавалі даць поўную магчымасьць разьвіцьця кулацтву, яны адмаўлялі значэньне калектывізацыі, як асноўнага сродку вырашэньня збожжавай праблемы і г. д. Правыя прапанавалі замест ліквідацыі кулацтва — капітуляцыю перад ім.

Ажыцьцяўленьне лініі правых азначала-б паражэньне партыі і дыктатуры пралетарыяту, азначала-б зрыў сацыялістычнага будаўніцтва і аднаўленьне капіталізму.

Партыя дала бязьлітасны бой праваму ўхілу. Яшчэ лістападаўскі пленум у 1929 годзе прызнаў несумяшчальным прапавядваньня погляду правага ўхілу з прабываньнем у партыі. Лідэры правых пад націскам крытыкі партыі і ЦК яшчэ тады капітулявалі перад партыяй, фармальна прызналі правату партыі. Але лідэры правых, за ўвесь пэрыяд да XVI зьезду сваімі паводзінамі пацьвердзілі як раз процілеглае. Яны не вялі змаганьня з правым ухілам, дыплёматычна ўхіляліся ад гэтага змаганьня. На самым XVI зьезьдзе партыі лідэры правых ня толькі ня прызналі проста, па-бальшавіцку, сваіх памылак, яны прабавалі абмежавацца «пакаяльнымі» заявамі, яны не сказалі аб тым, куды вядзе лінія правага ўхілу, яны не адмежаваліся ад гэтай капітулянцкай лініі.

Тэарэтык правага ўхілу ў нашай партыі, т. Бухарын пічыў зусім непатрэбным сказаць зьезду аб сваёй пазыцыі. Красамоўнае маўчаньне т. Бухарына нагадвае маўчаньне Троцкага ў часе XIV зьезду партыі.

Партыя не дазволіць займацца двурушніцтвам. Таму зьезд папярэдзіў партыю аб новых манэўрах, аб новай тактыцы апартуністых: «зьезд зварачае ўвагу ўсяе партыі на тое, што апартуністыя ўсіх копераў, асабліва правыя, ужываюць новы манэўр, які выяўляецца ў фармальным прызнаньні сваіх памылак і ў фармальнай згодзе з генэральнай лініяй партыі, не пацьвердджаючы сваё прызнаньне работай і змаганьнем за генэральную лінію, што на справе азначае толькі пераход ад адкрытага змаганьня супроць партыі да захаванага, ці чаканьня больш эручнага моманту для адваўленьня атакі на партыю.

Партыя павінна абвясьціць самую бязьлітасную вайну такога роду двурушніцтву і патрабаваць ад усіх, што прызнаюць свае памылкі, актыўнай абаронай генэральнай лініі партыі давесьці шчырасьць сваіх прызнаньняў. Невыкананьне гэтага патрабаваньня павінна пацягнуць за сабой самыя рашучыя арганізацыйныя меры».

Партызезд даў лідэрам правых апошнюю магчымасьць давесьці на справе сваю адданасьць лініі партыі. Гэтым зьезд яшчэ раз прадэманстраваў сілу нашай партыі і яе згуртаванасьць вакол ленінскага парткіраўніцтва.

Ужо пасьля зьезду правыя двурушнікі і прымірэнцы прабуюць прадставіць гэты факт так, што партыя зрабіла ўступку правым. Ёсьць нават гутаркі аб тым, што гэта ўступка парткіраўніцтва тым «масам, якія яшчэ ідуць за лідэрамі правых».

Нікчэмныя, бездапаможныя, фальсыфікатарскія патугі — інакш непьга назваць гэты манэўр, шыты белымі ніткамі. Ужо прадзьездаўскі пэрыяд ясна паказаў поўную ізаляванасьць групкі правых, поўнае банкрутства іх, поўнае давер'е партыйных мас, усяе партыі ленінскаму ЦК на чале з прызнаным правадыром нашай партыі — т. Сталіным. Толькі гэтым поўным правалам, гэтым поўным разгромам правай апазыцыі ,можна вытлумачыць новы паток «пакаяльных» заяў з боку апартуністых.

Цікава, што гэтыя гутаркі правых двурушнікаў пітаральна паўтараюцца замежным фашысцкім друкам. Цікава, што некаторыя польскія фашысцкія газэты далі такі загаловак паведамленьню польскага тэлеграфнага агенцтва аб увядзеньні лідэраў правых у ЦК і г. д.: «Уступка Сталіна», і г. д.

Правая апазыцыя разгромлена. Кулацкая сутнасьць пляцформы правых выкрыта перад шырокімі масамі рабочых, калгасьнікаў, працоўных. Але не пакончана з правым ухілам, які зьяўляецца адлюстраваньнем супраціўленьня кулацтва, капіталістычных элемэнтаў нашаму наступленьню. З правым ухілам не пакончана таму, што яшчэ існуе глеба для яго, бо «сіла правага апартунізму заключаецца ў сіле дробнабуржуазнай стыхіі, у сіле націску на партыю з боку капіталістычных элемэнтаў наогул, з боку кулацтва ў прыватнасьці». (Сталін). Таму правы ўхіл у пэрыядзе разгорнутага сацыялістычнага наступленьня зьяўляецца небясьпекай, на якую партыя накіроўвае і будзе накіроўваць галоўны агонь.

Партыя дасьць руйнуючы бой усякім найменшым спробам паменшыць значэньне правай небясьпекі, усякім дэмабілізацыйным настроям у адносінах да змаганьня з правым ухілам.

Аб існаваньні такога роду настрояў гаворыць ход цэлага раду кампаній, якія КП(б)Б праводзіць. Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі паказала, што ў радзе месц забываюць аб змаганьні з кулаком, не даюць адпору ўзмоцненай актыўнасьці кулацтва, паслабляюць змаганьне за калектывізацыю, арыентуюцца на самацёк. Аб гэтым гаворыць цэлы рад фактаў з Мазыршчыны, Случчыны і г. д., матар'ялы якія зьмешчаны ў апошніх нумарох «ЗЬВЯЗДЫ».

Партыя будзе і надалей весьці змаганьне на два фронты. Партыя не паспабіць змаганьня з «левымі» загібамі, настроямі, з рэцыдывамі трацкізму. Факты гавораць аб тым, што такія настрої яшчэ ня зжытыя ў некаторых зьвяньнях нашай партыі, аб тым, што ў паасобных зьвеньнях партыі недаацэньваецца індывідуальнік, не вядзецца змаганьня з перагібамі, а нават працягваюцца перагібы. Гэтыя «лявацкія» настрої і загібы жывуць правы ўхіл. Вядучы змаганьне на два фронты, партыя сьмяротным боем будзе біць па галоўнай небясьпецы — правым апартунізме, па ўсякіх праяўленьнях яго ў тэорыі і на практыцы, па ўсякіх правых поглядах, па прымірэнцтве да правага апарунізму.

«Зьезд абвяшчае погляды правай апазыцыі несумяшчальнымі з прыналежнасьцю да ВсеКП(б)» (з рэзалюцыі зьезду). Гэта пастанова зьезду, якая знаходзіць таксама як і ўсе яго пастановы поўнае падтрыманьне ўсяе партыі, і самых шырокіх рабочых мас —павінна быць бязьлітасна выканана. Партыя выкіне са сваіх радоў апартуністых адкрытых ці скрытых, бяз розьніцы. Партыя выкіне са сваіх радоў правых двурушнікаў, партыя ня дасьць сябе ашукаць фармальнымі заявамі аб «згодзе» з лініяй партыі.

Ачысьціўшы свае рады ад апартуністых, партыя павядзе пралетарскія казёны ў дапешчае разгорнутае наступленьне.

У ПАХОД ПА ПАПЕРУ

Усе формы масавай работы—на службу агляду

Папяровая прамысловасьць БССР і пэрспэктывы яе разьвіцьця

Папяровая прамысловасьць БССР, створаная на базе маёнтасьці ў Беларусі ад старога дарэвалюцыйнага часу ў вельмі дрэнным стане.

Ня гледзячы на гэта, дзякуючы гэрачным намаганьням рабочых мас, а таксама значным капіталаўкладаньням нам удалося ўжо ў 1926-27 г. давесьці выраб паперы да даваеннага ўзроўню.

У наступныя гады выраб удалося давесьці да разьмераў, якія значна перавышаюць даваенны ўзровень:

1913 г.	20,9	тыс.	тон паперы	100 проц.
1927-28 г.	22,5	„	„ „	107,3 „
1928-29 г.	30,5	„	„ „	145,5 „
1929-30 г.	43,1	„	„ „	205,6 „
(Чак. вык.)	47,5	„	„ „	226,5 „

На наступны-ж 1930-31 год праектуецца далейшае павялічэньне выпуску з давядзеньнем яго да 58.000 тон паперы, што ў адносінах да даваеннага часу дасьць 276,6 проц.

Гэткі бурны рост выпуску ў значнай сваёй часьці павінен быць аднесены як за кошт ленінага скарыстаньня старога абсталяваньня, так і часткаю за кошт увядзеньня ў эксплёатацыю адной новай папяровай машыны. Калі з агульнай масы прадукцыі выключыць выраб новае машыны, дык мы атрымаем, што тое самае абсталяваньне дае ў сучасны момант 184 проц. даваеннай прадукцыі.

Адначасова неабходна адзначыць, што калі ў 1926-27 годзе ў агульна-саюзным выпуску паперы беларуская папяровая прамысловасьць займала месца ў разьмеры 7,5 проц., дык у сучасны момант БССР дае ўжо каля 10 проц. усяго агульна-саюзнага выпуску, г. зн. рост удзельнай вагі на 33 проц.

Адзначаючы вялікія дасягненьні папяровай прамысловасьці БССР на працягу апошніх год, мы павінны адначасова падкрэсьліць і тое, што выкананьне пляну бягучага году з боку кольскасных і якасных яго паказальнікаў выклікае некаторую апаску. Калі асноўны плян з боку выпуску выконваецца задавальняўча—за 9 месяцаў 104,7 проц. — дык вынікі прыняты фабрыкамі абавязкаў у мэтах палягчэньня ўкладу паперы выконваюцца ў недастатковых разьмерах. За справаздачны выгляд выканана ўсяго толькі на 97,9 проц.

Сацыялістычнае спаборніцтва, якое ахапіла ўсе масы рабочых-папернікаў, пачынаючы з трэцяга кварталу 1928-29 годзе не дае ўсіх магчымых вынікаў.

Яшчэ горш стаіць справа з выкананьнем якасных паказальнікаў прамфінпляну. Зьнижэньне сабекошту замест прадугледжаных 12,2 проц. дасягнута за 8 месяцаў толькі ў разьмеры 8,3 проц. Асноўную прычыну невыкананьня трэба шукаць у тым, што ўстаноўленыя плянам нормы прастоў машын, страт валакна і інш. тэхнічна-эканамічныя паказальнікі ня зьніжаюцца, але паказваюць значнае адхіленьне ў бок павялічэньня.

Рабочая грамадзкасьць павінна змагацца ня толькі за выкананьне пляну, ня толькі за тое, каб даць краю найбольшую колькасьць паперы, але адначасова неабходна змагацца за паляпшэньне якасьці прадукцыі, за давядзеньне яе да стандартных умоў.

Фарсаваньне выкананьня вызначанага пляну рацыяналізатарскіх работ, хутчэйшае зьнішчэньне недахопаў у справе кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам—адзіная ўмова поўнага выкананьня пляну па ўсіх яго паказальніках і дадатковых абавязках па вырабе прадукцыі.

Некалькі лепш справа стаіць з кардоннымі фабрыкамі. Выконваючы павялічэньне заданьняў па вырабе кардону ў разьмеры 104,8 проц. (за 9 месяцаў), яны ўсё-ж адстаюць ад плянавых заданьняў па зьніжэньні сабекошту.

Роля папяровай прамысловасьці ў агульнай эканоміцы БССР, яе ўдзельная вага ў росьце з кожным годам памяншаюцца. Займаючы яшчэ ў 1926-27 годзе 15,6 проц. у каштоўнасьці прадукцыі ўсяе плянуючае ВСНРЕ прамысловасьці, мы маем для наступных гадоў яскрава выяўленую тэнденцыю да памяншэньня яе ўдзельнае вагі: у 1927-28 г.—13,5 проц., у 1928-29 г.—12,2 проц., у 1929-30 г.—9 проц., а ў 1930-31 годзе праектуецца, прыкладна, 5,5 проц.

Папяровая прамысловасьць БССР у сваім разьвіцьці заходзіць у тупік таму, што недастатковыя асыгнаваньні не даюць магчымасьці скарыстаць усе сыродковыя рэсурсы, якія ў нас ёсьць.

Між тым, сыродковая база БССР для папяровай прамысловасьці зьяўляецца спрыяючай. Апошнія дасягненьні тэхнікі далі шырокія магчымасьці скарыстаньня для папяровай прамысловасьці розных адкідаў дрэвазапрацоўчай прамысловасьці, якія выпуску са стадыі лябараторных вопытаў і ўсё гэта ў сучасны момант знаходзіцца ў пэрыяд практычнага скарыстаньня ў заводзкім маштабе.

Пры адзначаных відах сырцу БССР да канца пяцігодкі зможа атрымаць дадатковую прадукцыю ў колькасьці каля **100.000 тон у год.**

У адпаведнасьці з запатрабаваньнямі культурнага будаўніцтва мы будуем нашу пяцігодку. Намі мяркуецца: пашырэньне саломена-цэлюлёзнага заводу, фабрыкі «Гэрой Працы» да 9.000 тон з давядзеньнем выпуску ў канцы пяцігодкі да 20.000 тон, завод драўлянае цэлюлёзы ў Бабруйску з гадавой вытворчасьцю ў 20.000 тон; завод сульфатнай цэлюлёзы, сырэц для якога будуць служыць адкіды дрэвазапрацоўчай і каніфольна-шкіпідарнай прамысловасьці з вытворчасьцю ў 15-16 тыс. тон; кардонная фабрыка ў Віцебску з вытворчасьцю ў 20 тыс. тон і фабрыка ў Менску для выпуску паперы «Вэржэ» ў колькасьці 4.000 тон.

Зусім нязначны разьмер сродкаў, якія адпускаюцца для папяровай прамысловасьці выклікае моцнае затрыманьне тэмпаў будаўніцтва і ў той час, калі буйнейшыя гіганты будуюцца на працягу пяцітара-двух годы, нам прыходзіцца зацягваць будаўніцтва нашых невялікіх прадпрыемстваў на 2-3 гады.

Адначасова з гэтым, мы ўпіраемся ў пытаньне кадраў як рабочых, так і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу. Большасьць нашых прадпрыемстваў не забясьпечана, нават у мінімальнай меры неабходным тэхнічным пэрсаналам і кваліфікаванай рабочай сілай.

Неабходна ўсямерна фарсаваць пабудову новых школ ФЗВ. Неабходна таксама ў ВТНУ, які ў нас у БССР арганізуецца, аддаць максімум увагі справе падрыхтоўкі спэцыялістых па папяровай прамысловасьці.

Мы ўпэўнены ў тым, што заданьне XVI зьезду партыі аб стварэньні ўмоў, якія забясьпечваюць наша культурнае будаўніцтва, пры дружным падтрыманьні рабочай грамадзкасьці і пры садзейнасьці з боку вышэйшых органаў будзе поўнасьцю выканана і ўсамы кароткі тэрмін.

КОФМАН.

Парадак правядзеньня агляду спаборніцтва

На прадпрыемствах папяровай прамысловасьці

Усю апэрацыйную штодзенную работу на агляднае на месцох вядуць рэдкалегіі заводзкіх газэт, на якіх ускладаецца наступнае:

Арганізаваць безадкладна аглядавыя камісіі або камісіі садзейнасьці агляду з прадстаўнікоў парт'ячэек, КСМ, ФЗМК, заводакіраўніцтва, інжынэрна-тэхнічных работнікаў і лепшых ударнікаў. На абяцаных нарадах рэдкалегіі, ячэйкі, ФЗМК, заводакіраўніцтва і КСМ павінны быць абаўраны пляны дзейнасьці аглядавых камісій. Такія-ж нарады склікаюцца ва ўсіх цэхах і пры рэдкалегіях цэхавых газэт. Цэхавыя аглядавыя камісіі аказваюць за сваю работу перад заводзкімі камісіямі. Разам з аглядавымі камісіямі склікаюцца шырокія масавыя рабочыя сходы для азнаямленьня рабочых з задачамі і паралкам правядзеньня агляду.

Рэдкалегія і аглядавая камісія адзін раз у 10 дзён інфармуюць у пісьмовай форме аб праведзенай рабоце акруговаму, рэспубліканскаму і ўсесаюзнаму штабу агляду спаборніцтва.

Рэдкалегіі і аглядавыя камісіі правядзяць сваю работу па лініі: вытворчыя агляды асобных цэхаў або агляды па асобных агульна-заводскіх паказальніках (рацыяналізацыя, зьнижэньне сабекошту, прагулы, зьнижэньне браку), як найбольш важным пытаньнем у даны момант.

Адным з важных частак вытворчага агляду зьяўляецца збор прапаноў рабочых і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу. Неабходна праз брыгады выкліканць максімальны прыліў рабочых прапаноў па зьнижэньні недахопаў, па рацыяналізацыі, удасканаленьні працэсаў вытворчасьці, па вынаходніцтве і па пытаньнях капітальнага будаўніцтва.

Кампанію агляду-спаборніцтва неабходна зьвязаць з балявой задачай па зборы папяровай макулятуры і ўтылю, для чаго трэба зараз-жа на ўсіх прадпрыемствах стварыць ячэйкі зьбіраньня паперы.

Па скончэньні ўсесаюзнага агляду (1 кастрычніка) цэнтральны штаб на падставе матар'ялаў, якія будуць атрыманы ад рэдкалегій па ходзе агляду, на падставе матар'ялаў брыгад самога цэнтральнага штабу і на падставе вывучэньня газэтамі прадпрыемстваў папяровай прамысловасьці вылучаюцца 20 заводзкіх і 30 цэхавых рэдкалегій для прэміяваньня.

Сёньня, 19 ліпеня а 2 гадз. дня ў памяшканьні рэдакцыі газэты «Зьвязда» адбудзецца пасяджэньне штабу кіраўніцтва па правядзеньні кампаніі спаборніцтва нізавога друку ў змаганьні за паперу.

Выклікаюцца наступныя т.т.:

1) Мітнік («Зьвязда»), 2) Цудзін («Зьвязда»), 3) Дунец («Акцябр»), 4) Браўэрман («Рабочай»), 5) Левітэ («Акцябр»), 6) Харык (Велбумтрэст), 7) Фядотаў (ЦП саюзу друкароў), 8) Сьвірыноўскі (Дзяржгандальбел), 9) Мутэр (Уцільсыр'ё), 10) Прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ, Белкавпасаюзу, Белжылсаюзу, «Чырвоная Зьмены» і ЦП саюзу Папернікаў.

Яўка абавязкова.

Усебеларуская нарада па партасьвеце

Задача ўзмацненьня падрыхтоўкі партыйных кадраў, АСАБЛІВА НА ВЁСЦЫ —стаіць ва ўсёй вострасьці

З дакладу т. Сянкевіча

(З рэзалюцыі XVI партзьезду).

17-га ліпеня адчынілася Усебеларуская партнарада па пытаньнях партыйнай асьветы.

З дакладам аб чарговых задачах прапаганды марксызму і ленінізму ў сувязі з пастановамі XIII зьезду КП(б)В і XVI зьезду ВсеКП(б) выступіў загадчык культпропу ЦК КП(б)В тав. Сянкевіч.

— XVI зьезд нашай партыі, па пытаньні павышэньня тэарэтычнага ўзроўню членаў партыі, адзначыў наступнае: **«адзнак ідэйна-палітычны ўзровень значнай часткі партыйных кадраў усё яшчэ невыстарчальны, аб чым паказалі шматлікія факты антысеярадняцкіх перагібаў. Задача ўзмацненьня і падрыхтоўкі партыйных кадраў, асабліва на вёсцы стаіць ва ўсёй вострасьці»** (з рэзалюцыі XVI партзьезду).

Адначасова трэба сказаць—што ў асноўным партыя бязумоўна дабілася значнага ўзьняцьця тэарэтычнага ўзроўню асноўных мас сваіх членаў. Аб гэтым сьведчыць тое, што партыя за мінулы пэрыяд з посьпехам адбівала атакі на генэральную лінію і правых і «левых», партыя ўшчэнт разьбіла контрэвалюцыйны трацкізм; ў нацыянальных рэспубліках, у прыватнасьці у БССР, партыя дала рашучы адпор актывізацыі нацыяналістычных і шавіністычных элемэнтаў, партыя здолела мабілізаваць партыйныя і пралетарскія масы навакол пытаньняў нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Чыстка радоў нашай партыі, вопыт правядзеньня калектывізацыі паказалі, што як сярод радавых членаў партыі, асабліва вясковых, так і ў значнай ступені нашых кіруючых кадраў мы яшчэ маем неразуменьне асноў-марксыцка-ленінскага вучаньня. І таму больш пагыбленае вывучэньне партыйнай масы і асабліва партактывам асноў марксызму-ленінізму зьяўляецца нашай першачарговай задачай.

Сёньня, калі мы ўступілі ў этап сацыялістычнай рэканструкцыі, яшчэ больш яскрава выпукляецца значэньне лёзунгу, што без рэвалюцыйнай тэорыі ня можа быць рэвалюцыйнай практыкі і наадварот. Мы павінны канстатаваць што, пачынаючы ад нашага Камвузу да ніжэйшага зьвяна нашай партыйнай асьветы мы назіраем гэты адрыў тэорыі ад практыкі ў нашай вучобе.

Мы павінны нашу школу і ўсю партыйную сетку пабудаваць так, каб яны сталі сапраўды асяродкам і ініцыятарам у тым змаганьні, якое партыя вядзе супроць адхіленьняў ад ленінскай лініі. Падругое, мы павінны так перабудаваць усю нашу вучобу, каб уся наша партыйная сетка ў большай меры была зьвернута да вытворчасьці, да сёнешняй рэчаіснасьці.

Вось тыя дзьве задачы, якія стаяць перад намі.

Калі мы возьмем першую задачу, тую задачу, аб якой гаварыў т. Ленін, як трэба выхоўваць нашы парткадры, асабліва партыйны актыў, дык тут мы павінны інакш падыйсьці да пытаньня на вывучэньні ленінізму і гісторыі партыі.

Напрыклад, калі мы вывучаем клясавыя суадносіны ў нашай краіне, у прыватнасьці суадносіны паміж пралетарыятам і сялянствам, дык сёньня ленінскі лёзунг аб захаванні саюзу пралетарыяту з асноўнымі масамі сялянства павінен быць інтэрпрэтаваны ў [illegible] на падставе нашых посьпехаў і ў галіне індустрыялізацыі і ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Калі мы сёньня на падставе суцэльнай калектывізацыі паставілі задачу ліквідацыі кулацтва як клясы—трыадзіную ленінскую формулу, якая была правільнай, формулу, якая гаварыла аб саюзе з серадняком пры апоры на беднату для змаганьня з кулаком, гэтую трыадзіную формулу мэханічна перанесьці на сёньнішні этап нашага будаўніцтва было-б няправільна, гэта была-б не марксыцкая, ня ленінская пастаноўка. І таму зусім правільныя пастановы XVI зьезду нашай партыі аб тым, што ў нас сёньня гэтая формула відазьмяняецца ў напрамку таго, што ў раёнах суцэльнай калектывізацыі нашае апорай зьяўляцца калгасьнікі.

Калі мы, напрыклад, вывучаем нацыянальнае пытаньне ў яго ленінскай пастаноўцы, гэтае вывучэньне павінна быць увязана са змаганьнем за генэральную лінію партыі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве, якую мы праводзім сёньня.

Пытаньню клясавага змаганьня ў капіталістычных краінах, ацэнцы клясавага змаганьня, вывучэньню сёньняшняй расстаноўкі клясавых сіл, якая ёсьць у капіталістычных краёх, краёх калініяльных—усім гэтым пытаньням павінна быць вызначана асноўнае месца ў нашых праграмах і ў нашай вучобе.

Наконт іншых задач ад павароту нашай вучобы тварам да вытворчасьці, да рэканструкцыйных задач у нашай сацыялістычнай гаспадарцы, мы маем дырэктыву ЦК ад 12-VII-29 г., якая гаворыць, што ня менш аднай трэцяй часу ў школах і гурткох сеткі партасьветы павінна быць пакінута ў рэзэрве для пастаноўкі бягучых пытаньняў палітычнай, гаспадарчай і культурнай работы. Пытаньні прамфінпляну, вывучэньня пяцігодкі як усяго Саюзу, так і данага раёну, прадпрыемства, саўгасу ці калгасу, пытаньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, культурнай рэвалюцыі і г. д.,—усё гэта ў праграмах нашых партшкол, камвузаў і гурткоў павінна заняць тое месца якое паказана ў дырэктывах ЦК.

Тав. Сянкевіч спыняецца на імкненьні як партыйных, так і беспартыйных рабочых да асьветы.

— Я лічу, гаворыць ён — што гэта імкненьне рабочых мы павінны падтрымаць, але адначасова мы павінны глядзець за тым, каб гэтыя школы ня набывалі, як кажуць, дзяляцкага характару. У гэтых школах зусім мала месца выначаецца нашым грамадзкім дысцыплінам, пытаньням марксыцка-ленінскай тэорыі. З такімі тэндэнцыямі трэба весьці змаганьне.

Імкненьне рабочых да прафтэхнічнае асьветы перад некаторымі паставіла пытаньне—а можа ўвесьці элемэнты гэтай прафтэхнічнай асьветы ў нашу партшкоду? Я лічу, што элемэнты вузкага практыцызму ў нашых школах не павінны ўводзіцца. Лёзунг аб тым, каб партыя павярнулася тварам да вытворчасьці, павінен азначаць, што сетка партыйнае асьветы павінна так пабудаваць сваю праграму, каб партыйні вытворчага характару, (але па пытаньні вузка-тэхнічнага характару) запялі там належнае месца.

У задачы нашых школ ўваходзіць ня толькі ўзбраеньне членаў партыі марксыцка-ленінскай тэорыяй, але і тое, што мы праз нашы школы выхоўваем палітычных кіраўнікоў сацыялістычным будаўніцтвам. Мы падрыхтоўваем работнікаў і для цяжкай работы на вытворчасьці і кіраўніцтва нашым калгасным рухам і для кіраўніцтва нашым культурным сэктарам і г. д. і г. д. І таму ўжо ў саміх школах мы павінны навучыць веды па лініі, напрыклад, арганізацыі ўнутранога распарадку, пытаньні кіраўніцтва і г. д.

Гаворачы аб прапагандысцкіх кадрах, тав. Сянкевіч адзначыў невыстарчальную колькасьць гэтых кадраў, надзвычай слабую рабочую праслойку ў складзе нашых прапагандыстых, ніякі тоадзе нашых прапагандыстых, ніякі тоадзе нашых прапагандысцкіх кадраў. Задача пых прапагандысцкіх кадраў, падрыхтоўкі прапагандысцкіх кадраў, задача ўзмацненьня рабочага ядра сярод прапагандыстых, задача перападрыхтоўкі тых прапагандысцкіх кадраў, якія ў нас ёсьць, зьяўляецца адным з важнейшых задач, якая стаіць перад нашай арганізацыяй.

Спыніўшыся на формах у сыстэме партасьветы, тав. Сянкевіч сказаў. Перад намі стаіць задача ў першую чаргу ахапіць тыя масы партыйцаў, якія сёньня на даным этапе ўступілі ў нашу партыю. Гэтую задачу павінны выканаць у першую чаргу нашы першапачатковыя школы. Разам з гэтым перад намі стаіць задача павышэньня тэарэтычнага ўзроўню асноўных мас нашага актыву. З гэтай задачай павінна справіцца вячэрняя сэўпартшкола, вячэрняя Камвуз і г. д. І трэба сказаць, што з [illegible] рападрыхтоўкай актыву партыі ў [illegible] справа стаіць вельмі і вельмі дрэнна. Ня лепш справа стаіць і з перападрыхтоўкай кіраўнічых кадраў.

Падумаць над тым, каб у першую чаргу ахапіць тыя масы, якія прыйшлі ў нашу партыю з радоў ударнікаў, з рабочых, сталай вучобай і стацыянарнай сеткай, а таксама асноўныя кадры нашага актыву і трэцяе, каб даць ўсе магчымасьці для перападрыхтоўкі нашых кіраўнічых кадраў, знайсьці формы і мэтады—гэта павінна заняць увагу нашай нарады.

Коратка спыніўшыся на пытаньні аб сыстэме партыйнай асьветы, т. Сянкевіч падкрэсьлівае навуковасьць ацэнкі партвучобы з боку амаль [illegible] ўсіх партарганізацый. Дырэктыва аб прадастаўленьні спэцыяльнага дня для партвучобы ня выконваецца. Нашы кадры прапагандыстых скарыстоўваюцца абы-[illegible] ютна не па лініі іх непасрэднае работы і абавязкаў. Часамі правадное становішча нашых прапагандыстых, іх матар'яльнае становішча не зьяўляецца такім, якім яно павінна было быць [illegible] сёньнешні дзень.

— Я лічу,— гаворыць т. Сянкевіч,— што мы павінны на гэты бок зьвярнуць увагу. З тымі тэндэнцыямі недаацэнкі партвучобы, недаацэнкі неабходнасьці узьняцьця тэарэтычнага ўзроўню ўсіх нашых партыйных кадраў, пачынаючы з нізавога работніка да кіруючых, ядзе тэндэнцыямі апартуністычнымі, трэба самым рашучым чынам змагацца.

Спрэчкі па дакладу т. Сянкевіча

Спрэчкі, якія разгарнуліся па дакладу т. Сянкевіча, а таксама і па дакладу т. Канакоціна падкрэсьлівалі яўную недаацэнку партвучобы, недаацэнку тэарэтычнага ўзроўню нашых партыйных кадраў.

Тав. Баброў (залінейны раён, Гомельшчына) гаворыць, што да таго часу, пакуль тыльным цартыйнай вучобы будзе займацца вузкая група культпропаў, а ня ўся партыйная маса—станоўчы вынікаў у гэтым пытаньні мы мець ня будзем. Бо да гэтага дня ячэйкі на мясцох, гаспадарчыкі, прафарганізацыі недаацэньваюць рэвалюцыйныя тэорыі і вельмі слаба займаюцца пытаньнем пастаноўкі партасьветы.

— У мэтах дастасаваньня партвучобы трэба рашуча стаць на шлях перабудовы партасьветы па вытворчым прынцыпе, арганізуючы групы, гурткі і школы пры буйных прадпрыемствах і толькі для малых ячэек пакінуць зьмешаныя групы і школы.

Гаворачы аб неабходнасьці дастасаваньня ўсёй работы партвыхаваньня да паасобных груп рабочых, аб неабходнасьці ахопу партвучобай 100 проц. партарганізацый і беспартыйнага актыву—тав. Баброў спыняецца на фактах недаацэнкі гэтай задачы на Гомельшчыне. У Сталінскім раёне мы маем значную частку рабочых, якія [illegible] 4-х гадзін выяжджаюць у вёскі, што не дае [illegible] вучобы. Трэба будзе паставіць перад сабой задачу пабудовы партсеткі па месцы жыхарства ў чырвоных кутках, інтэрнатах і г. д. для ленцага абслугоўваньня рабочых, якія жывуць у вёсцы. Мы лічылі неабходным арганізацыю клюбу-вагону пры рабочых цягніках, але, ня гледзячы на рад пастаноў з боку Сталінскага РК КП(б)Б, правесьці гэтыя мерапрыемствы ў жыцьцё ніяк не ўдаецца, дзякуючы інэртнасьці і няпаважальскім адносінам чыгуначных арганізацый да партасьветы.

Культпропу трэба паставіць пытаньне перад ЦК і ўзьдзейнічаць на кіраўніцтва Заходнай чыг., дабіцца абсталяваньня вагона-клюбу Гомельскай чыгункі. Бяз гэтага мы сёлета ня здолеем ахапіць частку рабочых, а таксама сарвём культвыхаваўчую работу сярод іх.

Тав. Эпштэйн гаворыць аб думках і настроях, якія ёсьць у нізавой партарганізацыі і ў нашых прапагандыстых, гэтыя думкі зводзяцца да таго, што нібыта ў прарывах партвучобы вінавата калектывізацыя, аб'ектыўныя ўмовы і г. д.

— Я лічу гэтыя думкі памылковымі. Яны змазваюць пытаньні партвучобы. Галоўнай прычынай прарыву зьяўляецца адрыў нашай партыйнай вучобы ў значнай ступені ад сучаснасьці, ад нашай практычнай работы. Слухач нашай партасьветы думае атрымаць ад партыйнай школы ня толькі агульнатэарэтычныя веды вузка-акадэмічнага характару, але і веды, якія дапамагалі-б яму ў практычнай работе. Адсюль наша задача перабудаваць сетку партасьветы, у адпаведнасьці з вытворчым прынцыпам.

— Мы павінны зрабіць рашучы пералом у справе кіраваньня партвучобай. Можна падаць такі прыклад, калі ня толькі партячэйкі і РК, але нават і АК адночасцца нядбайна да партвучобы. Калі адзін з прапагандыстых, лаеат, намесьнік загадчыка АПА АК прасіў адзін-два дні ў месяц адпачынку (ён увесь час разьяжджае), каб узьняць свой тэарэтычны ўзровень, пачытаць га зэты, яму адказалі: «у нас калектывізацыя, паяжджай на раён, а нікопт вучобы—як хочаш вучыся».

Тав. Эпштэйн у сваім выступленьні падкрэсьліў слабае мэтадычнае кіраўніцтва партвучобай.

Аб недаацэнцы партвучобы гаворыць т. Шчыцько (Бабруйшчына). Калі пачынаеш гаварыць аб вучобе, дык кажуць: «зараз справа ня ў гэтым, братка мой, трэба зараз усю бальшавіцкую ўвагу зьвярнуць на калектывізацыю». Пад відам калектывізацыі пачынаюць прыпінаць усе іншыя віды работы, у тым ліку і партасьвету, а таго не разумеюць, што ўся наша сыстэма партасьветы падрыхтоўвае і індустрыялізацыі нашага краю.

Я хачу,— гаворыць т. Шчыцько,—з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што палітычная недаацэнка ёсьць бязумоўна і ў акруговых партыйных арганізацыях. А калі гаварыць аб камсамоле—там проста поўная недаацэнка партвучобы. На Бабруйшчыне ў нас партасьвета амаль што правалена. Гэта канстатавала і наша акруговая партыйная канфэрэнцыя.

Гаворачы аб падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў т. Шчыцько падаў агідненькі факт недаацэнкі ў напрамку увязкі тэарэтычнай вучобы з практычнай. У ячэйках прапрацоўваецца пытаньне аб правых і «левых» загібах у нашай партыі і ў Камінтэрне. Аб права-апартуністычных вылазках у Камінтэрне гаворыць, а аб сваіх памылках ні слова. Гэта ёсьць вялікі прарыў ў нашай партвучобе. Некаторыя ячэйкі лічаць, што школы не павінны ўдзельнічаць ва ўсёй сыстэме нашай партработы. Нават сам сакратар ячэйкі казка: «школь, як школа. Седай толькі кнігу». Вось як разумеюць школу.

Аб падрыхтоўцы прапагандысцкіх кадраў, аб невыстарчальнай рабочай праслойцы гэтых кадраў гаварыў т. Івашкевіч.

Ліквідацыю акруг правесьці з максымальнай арганізаванасьцю

РАШУЧА ЗМАГАЦЦА З ДЭМАБІЛІЗАЦЫЙНЫМІ НАСТРОЯМІ У АКРУГАХ

90 проц. АКРУГОВЫХ ПРАЦАУНІКОУ—НА РАЁНЫ

Пры НК РСІ створана спэцыяльная камісія ў складзе 7 чалавек для дапамогі дзяржаўнай камісіі па ліквідацыі акруг.

Учора адбылася нарада працаўнікоў НК РСІ, на якой быў заслуханы даклад памесьніка наркома т. Іванова аб задачах, якія стаяць перад НК-РСІ у сувязі з пастановаю ЦК УсеКП(б) аб ліквідацыі акруг.

Работнікі НК РСІ пастанавілі ліквідаваць сябе мабілізаванымі на ўвесь час правядзеньня ліквідацыі акруг і пераключыцца на ўдарныя тэмпы работы. Кожная група НК РСІ запрапанавана зьвязацца з адпаведнымі групамі садзейнасьці рэарганізацыі апарату, якія павінны ў бліжэйшым часе быць арганізаваны пры ўсіх наркаматах (трэба адзначыць, што на сёньняшні дзень яшчэ ні ў адным наркамаце такія групы не арганізаваны).

Кожная група НК-РСІ узяла на сябе абавязак прапрацаваць структуру штатаў у цэнтры і ў раёнах. НК-РСІ павінен зараз-жа ўжыць меры да змаганьня з дэмабілізацыйнымі настроямі сярод акруговых работнікаў, весткі аб чым ужо ёсьць.

Апрача таго, ужо заўважаецца імкненьне з боку раду наркаматаў пакінуць лепшых акруговых работнікаў у цэнтральным апараце. Нарада работнікаў НК-РСІ пастанавіла сачыць за тым, каб лепшыя работнікі акруговых устаноў трапілі б ў раённыя ўстановы.

Вялікая ўвага павінна быць зьвернута на ўзмацненьне інструктарскага апарату ў мэтах паскарэньня работы па ліквідацыі акруг.

Рэарганізацыя апарату Віцебшчыны падрыхтавала глебу

Што дала рэарганізацыя Віцебскай апытна-паказальнай акругі. Мэтай рэарганізацыі, як вядома, было ўзмацненьне раённага апарату, перакідка сродкаў і сіл у нізавую сыстэму, лепшае абслугоўваньне шырокіх мас працоўнага насельніцтва.

Зараз ужо ёсьць некаторыя вынікі, якія даюць магчымасьць меркаваць аб тым, што дала рэарганізацыя.

Да рэарганізацыі акрвыканком з усімі аддзеламі і інспэктарыятамі меў 449 служачых. Зараз у апараце АВК працуюць толькі 236 чал. Да рэарганізацыі на ўтрыманьне апарату і на іншыя выдаткі па АВК і яго аддзелах выдаткавалася 706 тыс. руб., зараз—540.000 руб. Узмацніўся апарат і сродкі нізавых савецкіх органаў. Гарсавет, напрыклад, меў 23 служачых, зараз—104. На яго ўтрыманьне выдаткавалася раней 39 тыс. руб., зараз—177 тыс.

Апараты райвыканкому павялічыліся з 320 да 478 чал.; выдаткі з 363 тыс. да 565 тыс. руб.

Апараты сельсаветаў вырасьлі з 317 да 422 чал., выдаткі з 177 тыс. да 238 тыс. руб.

Павялічылася зарплата працаўнікоў райвыканкомаў—старшыні з 95 да 120 р., сакратара з 75 да 110 руб., агранома—з 110 да 120 р., бухгальтара—з 75 да 100 р., рахункавода з 38 да 50 руб. Зарплата старшыні і сакратароў сельсаветаў павялічылася з 28 да 40 руб.

У сувязі з рэарганізацыяй, 40 адказных акруговых працаўнікоў пераведзены ў раёны, апарат гаго ў рэбны паспана 10 зьмяшчэньчыкаў, 63 кіраўнікі, два агранома, 12 кааперацыйных працаўнікоў. Для ўзмацненьня сельскіх саветаў, на работу ў сельсаветы паслана 35 рабочых ад варштату.

Зараз для поўнага ўкамплектаваньня штатаў працаўнікоў РВК і сельсаветаў не хапае 30 адказных і тэхнічных работнікаў і 240 с.-г. спэцыялістых.

Недахват у спэцыялістых з-за адсутнасьці патрэбных кадраў ня можа быць ліквідаваны сваімі сіламі.

Карыстаючыся вопытам 6-месячнай работы рэарганізаванага апарату, трэба сказаць, што рэформа сябе поўнасьцю апраўдала, значна палепшыла работу нізавога апарату, павялічыла яго адказнасьць, палепшыла сувязь з працоўным насельніцтвам.

Рэарганізацыя пішні раз пацьвярджае матэгоднасьць ліквідацыі акруг і дасьць магчымасьць значна хутчэй і з посьпехам правесьці гэтую работу па Віцебскай акрузе.

Т.

БАРАЦЬБА ЗА ПРАМФІНПЛАН

ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ ПАГАРШАЕЦЦА

Зьніжэньне сабекошту замест 11 проц. даведзена да 7 проц.

З бальшавіцкай упартасьцю і рашучасьцю ліквідаваць прарывы

Загад старшыні ВСНГБ

Учора старшыня ВСНГБ т. Грысевіч апісаў загад, які характарызуе небясьпечнае становішча выкананьня прамфінпляну нашай прамысловасьці. У загадзе гаворыцца:

«Вытворчая праграма за 8 месяцаў недавыканана на 4,2 проц. Найбольшы ўдар наглядаецца па скурана-абутковай, фасфарытнай, галянтарэйнай, бакуўнна-папяровай, фанэрнай, цагольнай прамысловасьці і па вытворчасьці акуляраў.

Работа па падрыхтоўцы, вывазцы і сплаве лесаматар'ялу праходзіць вельмі марудна. Пад яўнай пагрозай знаходзіцца выкананьне пляну па тарфяной прамысловасьці. Зусім нездавальняюча разгортваецца капітальнае будаўніцтва. Папярэднія даныя паказваюць, што чэрвень месяц ня ўнёс нізкіх зьмен у работу прамысловасьці. Наадварот, чакаецца скарачэньне аб'ёмаў вытворчасьці.

Значны прарыў ёсьць таксама і ў адносінах зьніжэньня сабекошту, якое за 7 месяцаў замест 11 проц. вызначаных планам, дае толькі каля 7 проц. Май месяц паказвае некаторае пагоршаньне паказальнікаў. У той час, калі ў красавіку зьніжэньне сабекошту дасягнула 11 проц., у маі зьніжэньне сабекошту адзначаецца 10,5 проц. Асабліва дрэнна зьніжэньне ідзе па лініі шкляной прамысловасьці, махорачнай і паліграфічнай. Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што належнага зруху ў рабоце аб'яднаньняў і большай часткі прадпрыемстваў няма.

Як і раней прыходзіцца канстатаваць наяўнасьць раду арганізацыйна-тэхнічных недахопаў, зьніжэньне якіх праходзіць вельмі марудна.

Як і ў мінулыя месяцы на работу прамысловасьці аказвае адмоўны ўплыў спабае тэхнічнае кіраўніцтва, неўвязкі ўнутрызаводзкага плянаваньня, спазьненьне з увядзеньнем у эксплёатацыю новага будаўніцтва. Слаба разгортваецца змаганьне са стратамі на вытворчасьці, няма рашучасьці ў правядзеньні рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і зусім недапушчальна марудна праходзіць правядзеньне адзіначальля на прадпрыемствах.

Да гэтага часу няма яшчэ сур'ёзнага зруху ў справе паляпшэньня якасьці прадукцыі.

Як зусім недапушчальны факт зьвяртае на сябе ўвагу неажыцьцяўленьне мерапрыемстваў па ахове працы і тэхніцы бясьпекі. Такое становішча стварае вельмі ненармальныя ўмовы работы на прадпрыемствах.

Адмоўны ўплыў на работу прамысловасьці мае таксама паспалбленьне рэгулюючай работы з боку раду аб'яднаньняў. Да гэтага часу пляны ягчэ не даведзены да большай часткі прадпрыемстваў і цэхаў.

Вытворчая актыўнасьць рабочых мас, накіраваная на адхіленьне усіх недахопаў, якія ёсьць на прадпрыемствах, скарыстоўваецца недастаткова.

Усё гэта пры адсутнасьці рахункі пераломуў у рабоце прамысловасьці складае пагрозу выкананьня пляну, што вельмі цяжка адаб'ецца на становішчы народнай гаспадаркі.

Атынкоўшчык Шыфрып на пабудове 76 кватэрнага дому, лепшы ўдарнік, вытворчы стаж 30 год.

Становішча, якое стварылася, высоўвае, як ударную задачу, неабходнасьць максымальнай канцэнтрацыі ўвагі і мерапрыемстваў на працягу застаўшагася кварталу, які фактычна павінен стаць рашаючым.

Выходзячы з усяго гэтага, прапаную пад асабістую адказнасьць дырэктараў аб'яднаньняў і прадпрыемстваў на падставе існуючых дырэктыў партыі і апошняй пастановы прэзыдыуму ВСНГ БССР прыняць катэгарычныя мерапрыемствы да зьніжэньня пералічаных недахопаў, якія тармозяць нармальны ход вытворчасьці.

Асабліву ўвагу ВСНГБ зьвярнуць на неабходнасьць дасягненьня каранных пералому ў справе зьніжэньня сабекошту, паляпшэньня якасьці прадукцыі. Выясьнячна павінны быць выкананы вызначаныя мерапрыемствы па лініі аховы працы і тэхнікі бясьпекі, усклаўшы суровую адказнасьць за выкананьне гэтых мерапрыемстваў на непасрэдных выканаўцаў.

Кіраўніком песаб'яднаньня, будаўнічага аб'яднаньня і торпаб'яднаньня прапануецца прыняць катэгарычныя меры да выкананьня пляну па падрыхтоўцы і вывазцы, а таксама і сплаве лесаматар'ялу, ажыцьцяўленьні пляну па вырабе цэглы і здабычы торфу.

Асабліву ўвагу загад зьвяртае на катэгарычную неабходнасьць выкананьня пляну капітальнага будаўніцтва, ад чаго ў значнай меры будзе залежыць ажыцьцяўленьне пляну капітальнага будаўніцтва.

Для выкананьня гэтай баявой задачы неабходна дабіцца кіраўнічага пералому ў рабоце прамысловасьці шляхам практычнага ажыцьцяўленьня прадпрыемствамі ВСНГ усіх дырэктыў партыі і прэзыдыуму ВСНГ. Неабходна мабілізаваць увесь гаспадарчы апарат і змаганьні рабочае плясы, усебаковна скарыстаць сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва і неадкладна правесьці ў жыцьцё.

* *

Парткалектыў, дырэкцыя і заўком заводу «Энэргія» сыгналізуюць аб тым, што Менскае аддзяленьне Белдзяржбуду грыбае пабудову новага кацельнага цэху.

Выходзячы з разьліку, што кацельны цэх будзе пабудаваны ў бягучым гаспадарным годзе, г. зн. да 1-га кастрычніка 1930 г., заводакіраўніцтва дало свае заводу на ўключэньне ў вытворчую праграму заказу па вырабе тарфяных элеватараў на суму 3.500 тысяч рублёў, што складае 50 проц. патрэбы СССР у тарфяных машынах. Акрамя таго, паводле заказу ВНТС, гэты кацельны цэх павінен вырабіць рэд іншых работ, якія маюць вялікае значэньне для Савецкага Саюзу.

Такім чынам, са зрывам пабудовы кацельнага цэху зрываецца ўся праграма заводу на 1930-31 год і ствараецца пагражаючае становішча па выкананьні важнейшых заказаў.

Мен. аддзяленьне Белдзяржбуду ўвесь час адцягвала пачатак работ па пабудове цэху. Да работы прыступлена толькі 25 чэрвеня (калі да канца будаўнічага сазону засталося ўсяго 2-2½ месяцы).

На 18 ліпеня фундамант гатоў усяго толькі на 30 проц., цэмэнту маецца толькі на 6 дзён. Зусім няма чырвонай цэглы і каменьняў для скончэньня фундамэнту. З прычыны нераспарадчасьці Мен. аддзяленьня Белдзяржбуду, матар'ялу няма і невядома калі яны будуць, заводакіраўніцтва затрацілі 6 вагонаў свайго каменьню, якое было прызначана для брукаваньня заводзкага двара. Калі-ж дырэктар заводу і сакратар парткалектыву па гэтым пытаньні прышлі да намесьніка загадчыка Менскай канторы Белдзяржбуду, намесьнік загадчыка тав. Бімбат абмяжоўваўся бюракратычнымі адказамі. Напрыклад, ён адказаў, што ён ня вінаваты, а вінаваты «аб'ектыўныя прычыны», няма транспарту, ня хочуць да вас ехаць, што я, моў, матар'ялу не нараджу і г. д.

Відаць, што тав. Бімбат свае абавязкі да капітальнага будаўніцтва ня зусім грунтоўна разумее, і што яму напляваць на тое, што заказы на 4 мільёны рублёў, якія (заказы) вельмі і вельмі патрэбны, ня будуць выкананы.

Трэба думаць, што адпаведныя арганізацыі прымуць адпаведныя меры, якія пакажуць, тав. Бімбату, як трэба працаваць і папярэдзяць зрыў пабудовы кацельнага цэху.

БССР павінна заняць першае месца па саўгаснай сьвінагадоўлі

Тэмпы-ж работы раду саўгасаў, перашкоды з боку некаторых гаспадарчых і каапэрацыйных арганізацый, бязьдзейнасьць мясцовых органаў—не гарантуюць пасьпяховага ажыцьцяўленьня гэтай задачы

Стварэньнем буйных савецкіх фабрык мяса нанясем руйнуючы ўдар па кулаку

Задача сьвінагадоўлі павінна быць выканана

«Галоўная наша машына па вырабе мяса ў бліжэйшыя гады—сьвіньня». Так сказаў т. Я. А. Якаўлеў у сваім дакладзе на XVI зьезьдзе УсеКП(б)В. А мяса зьяўляецца асноўным прадуктам, які надпаўляе ў рабочым выдаткаваньні ім мускульныя сілы. Адсюль, відавочна, што ад сьвіньні, як жывой машыны на вырабе мяса, у значнай меры залежыць бесьперабойная работа мільёнасільнай мускульнай турбіны сацыялістычнай пяцігодкі.

На дарэмна наркамзем БССР т. Рачыцкі, наглядаючы дрэнныя, цесныя сьвінарнікі беларускіх вёсак, густа-зялёныя, выразна-акрасьленыя радкамі буйной батвы бульбяныя палеткі,—узяў на сябе сьмелась павялічыць больш чым у два разы цэрпнмачатковую праграму саўгаснага вырабу сьвініны.

50 тысяч сьвінаматак (замест вызначаных спачатку 21 тысячы) павінны былі скамплектаваны да зімы бягучага году ў 70 савецкіх гаспадарках, выдучаных па БССР усесаюзнаму трэсту «Сьвінавод». 250 тысяч галоў таварных сьвіней ад гэтага матачнага гурту павінна быць выкармлена па беларускай бульбе і іншых мясцовых кармох (уключаючы пашы) да лета 1931 году.

Такая праграма БССР па саўгаснай сьвінагадоўлі на бліжайшы год. Але 250 тысяч таварных сьвіней—гэта больш паловы (62,5 проц.) усяго таварнага выхаду сьвініны па ўсесаюзным сьвінтрэсьце на 1930-31 год. (400.000 галоў). А гэта значыць, што БССР адводзіцца першае месца ў саўгаснай вытворчасьці сьвініны, што на гэту імэнна рэспубліку з усяго Савецкага Саюзу ўскладаецца выкананьне пераважочан часткі пляну забесьпячэньня пралетарскіх цэнтраў мясам у самы цяжкі год пяцігодкі.

Гэта задача павінна быць выканана, якія-б цяжкасьці яна з сябе не ўяўляла. Невыкананьне яе, паслабляючы напружаныя мускулы сацыялістычнага будаўніцтва, можа павесьці да замаруджаньня апошняга і, значыць, да падаўжэньня намі парыду харчовых затрудненьняў, якія мы перажывалі.

А што робіцца адпаведнымі арганізацыямі БССР для зьвінчэньня ўсяго гэтага? Ці выстарчальна і своячасова забясьпечваецца самы адказны ў даны момант «мясны вучастак» фронту змаганьня з перашкодамі сацыялістычнаму будаўніцтву?

Відавочна, мала.

Пачнем з забесьпячэньня сьвінгасаў матачным матар'ялам. Сьвінаадкормачныя арганізацыі і ў тым ліку Белмяса і ЦРК дагэтуль лічаць лепшым адпраўляць сьвіньматак у разьніцу, чым здаваць іх «Сьвінаводу». Так, напрыклад, па аднэй з белмясаўскіх сьвінаводных гаспадарак Гомельшчыны (Нова-Беліца) вызначана здаць «Сьвінаводу» толькі 60 сьвіньматак. «Больш ніяк нельга»—запэўняе Белмяса. Між тым, па прызнаньні самых работнікаў паказанае гаспадаркі і па асабістым уражаньні, новабеліцкі сьвінарнік Белмяса мог бы без асаблівых затрудненьняў здаць ня менш 300 сьвіньматак. А колькі яшчэ такіх сьвіньматак навяўленых, утоеных ад «Сьвінавода», на якога партыяй і саюзным урадам ускладзена вядучая роля сьвінагадоўлі бліжэйшых год?..

Іншым, вельмі паражальным месцам саўгаснага сьвінаводзтва зьяўляецца будаўніцтва. Тав. Якаўлеў на XVI партзьезьдзе заклікаў да найбольшага патаненьня будаўніцтва сьвінарнікаў і абслугоўваючых апошняе будынкаў, да найменшага выдаткаваньня і найбольшага выкарыстаньня мясцовых будаўнічых матар'ялаў. Між тым, Лесбел амаль зусім не адпускае для гэтага будаўніцтва пілавачнага матар'ялу, і расцілоўку бярвеньняў прыходзіцца вельмі часта весьці на месцы будуўлі ручнымі сродкамі, што, зразумела, замаруджвае і вельмі падаражае будаўніцтва. Ня танна каштуе і замена жалезных цьвікоў, якіх не хапае... драўляным, са сьвідраваньнем дзірак для іх, што мела месца ў будаўніцтве сьвінаводчага саўгасу Горкі-Абчаг. З другога боку, прыметна павялічэньне «узорнасьці», якая зьдзіўляе нарэдка узорнай няпрыгоднасьцю і падаражаньнем кожнага сьвінамесца да 300—500 руб. і больш (Гомель—адкормачнікі ЦРК—і Менск—бэконны сьвінаадкормачнік, ці «исправдом», як яго жартліва завуць, Белмяса).

Нарэшце, кармы... Нам даводзілася сустракаць дзьве побач разьмешчаныя гаспадаркі, з якіх адна забясьпечана толькі збожжавымі кормам (ячмень), а другая—толькі бульбаю, і кожная ў пасобку выдаткавала выключна свой корм, не папрабаваўшы пават для ўзаемнай карысьці і агульнага паляпшэньня адкормачных умоў падзяліцца з суседам сваімі кармавымі запасамі. Мала ўвагі аддаецца таксама сьвінаводным гаспадаркам мясцовым кармам. Многія дырэктары саўгасаў лічаць за лепшае хныкаць з поваду неакуратнасьці Саюзхлеба замест таго, каб шырока скарыстаць добры мясцовы корм, якім зьяўляецца бульба і якой шмат у БССР.

— Але бульбу нельга здаваць у сырцным выглядзе. Яе трэба варыць, а для гэтага няма катлоў...

І зноў дакорлівыя зрокі ў бок Масквы. Між тым, мноства катлоў без карысьці іржавеюць у фарбавальнях, клеварнях і г. д., якія спынілі сваю вытворчасьць. І ці зроблена спроба мабілізаваць такія катлы для патрэб сьвінагадоўлі? Не.

БССР знаходзіцца ўжо ў такім сацыялістычным узросьце, калі самастойна, бяз «пянькі», можа выконваць узятыя на сябе сьмелась сацыялістычныя абавязацельствы. Больш ініцыятывы, больш энэргіі ў захаваньні за сабой першага месца па саўгасным вырабе сьвініны для рабочага стала—і ўвесь пралетарыят СССР даможа ёй там, дзе сапраўды акажацца патрэбнай яго дапамога.

Брыгадзір «Правды» і Наркамзему СССР А. ЭЛЬПЭРЫН.

Сьвінагадоўля ў заняпадзе

Сьвінагадоўлі ў камуне «Экімань» (Попацкі раён) аддаецца вельмі мала ўвагі. Сьвіньні там добрае пароды, але ўтрымліваюцца ў надта дрэнных умовах.

Сьвінарнік цёмны, ніколі не праветрываецца. Цэлыя хмары мух віснуць у ім. Гадзіна высокая тэмпэратура.

На пытаньне, чаму вы не выпускаеце сьвіней часамі на волю, старшыня праўленьня адказвае:

— У нас няма каму за імі глядзець, а па-другое,—яны папсуюць двор.

Раённы жывёлавод і не заглядвае ў камуну.

Брыгадзір «Зьвязды» А. МІКІЦІН.

Калгас «Пралетары» Менскае акругі. На здымку: малочная жывёла падаўжна закупленая для калгасу.

Ударных тэмпаў яшчэ няма

Беларускія сьвінаводчыя саўгасы, якія ўваходзяць у склад трэсту «Сьвінавод», павінны даць у будучым годзе да паўтара мільёна пудоў сьвіное прадукцыі (мяса і сала) для рабочага забесьпячэньня. Такое вялікае і адказнае заданьне абавязвае ўсе арганізацыі і ўсіх пасобных работнікаў, так ці інакш зьвязаных з арганізацыяй сьвінаводчых арганізацый, усялякім спосабам дапамагаць гэтай справе, каб яна магла хутка прасунуцца наперад. Абавязак нашага друку і нашай грамадзкасьці — са ўсёй уважлівасьцю сачыць за ходам арганізацыі сьвінаводных гаспадарак, за кожным крокам у гэтай рабоце, каб своячасова можна было сьвінчыць тыя перашкоды, якія тут узьнікаюць.

«Белмяса» пасьля двухмесячнай цягніны, пасьля ўсялякіх агавораж і хістаньняў, пад уплывам грамадзкасьці і пад націскам зьверху, нарэшце, падпісала дагавор з беларускай канторай «Сьвінаводу» на пастаўку 15.000 сьвіньматак. Але адна справа падпісаць дагавор ды яшчэ пад вялікім націскам, а другая справа — яго ажыцьцявіць. І вось, зараз «Белмяса» марудзіць з выкананьнем дагавору і сьвіньматак (ад загатовак, ад кантрактацыі) пакуль не здае саўгасам.

Адкормачныя пункты каапэрацыйных і загатоўчых арганізацый, атрымаўшы загады свайго начальства, або па сваёй уласнай ініцыятыве, таксама катэгарычна адмаўляюцца ад здачы сьвіньматак саўгасам «Сьвінаводу». Справа часамі даходзіць да простых шкодніцкіх актаў — «мы лепш зарэжам сваіх сьвіней і вам не дамо». Крутгінскае спажывецкае таварыства, Аршанскай акругі (паводле вестак «Сьвінаводу»), дведаўшыся аб тым, што яно абавязана здаць сьвіньматак Сьвінаводтрэсту, зарэзала 12 сьвіней. Справу гэту трэба неадкладна расьсьледаваць і вінаватых прыцягнуць да суда.

Іншыя адкормачныя пункты ўтойваюць колькасьць сьвіньматак, якія ў іх ёсьць, і кіраўніком «Сьвінатрэсту» прыходзіцца заводзіць спэцыяльную «агентуру» для праверкі гэтых вестак. Для таго, каб налажыць канец гэтай блытаніне, СНК даручыў Наркамзему і Наркамгандлю вылучыць адказных работнікаў для неадкладнага абсьледаваньня на месцы наяўнасьці сьвіньматак на адкормачных пунктах.

Але і самі саўгасы (прынамсі, многія з іх) ня прымаюць энэргічных мер да ўкамплектаваньня сваіх гаспадарак матачным матар'ялам — марудзяць з прыёмкай сьвіньматак ад іншых саўгасаў, ня выкарыстоўваюць усіх магчымасьцяў па абмене сваіх сьвіней на сьвіньматак сярод сваіх рабочых і акалічнага сялянства. Толькі некаторыя саўгасы прасунуліся ўперад у справе камплектаваньня. Саўгас «Баноцэ» (Полаччына), ужо мае 147 матак, «Харомцы» (Бабруйшчына)—193 маткі, «Старая Беліца» (Гомельшчына) — 160 матак.

Плян будаўніцтва (матачнікоў і адкормачных пунктаў) па саўгасах «Сьвінатрэсту» ў гэтым годзе вызначаецца ў суме амаль што 9 млн. руб. Пры наяўнасьці такога буйнога пляну будаўніцтва фактычна пачалося толькі ў пасобных саўгасах, а ў большасьці саўгасаў да будаўніцтва яшчэ ня прыступілі — і тут навісае сур'ёзная пагроза. Белкапгасбуд пакуль ня будуе, а ўсё яшчэ «прыцэльваецца». Нарада дырэктароў сьвінаводчых саўгасаў і старшынь рабочкомаў, якая гэтымі днямі адбываецца ў Слуцку, адзначыла, што дзесятнікі, ці кіраваньня Белкапгасбудам, вельмі нізкай кваліфікацыі. Многія дырэктары саўгасаў, атрымаўшы катэгарычную дырэктыву — выбраць месца і пачаць будаўніцтва — замест разгортваньня работы пішуць запытаньні і запасаюцца рознымі паперкамі «на ўсякі выпадак», у мэтах самастрахоўкі.

Уся сур'ёзнасьць становішча з будаўніцтвам зараз упіраецца ў нястачу рабочай сілы і тэхнічнага пэрсаналу. Патрэбны тэрміновыя і энэргічныя меры (вярбоўка рабочай сілы ў іншых раёнах, прэміяваньне дэфіцытнымі таварамі і г. д.).

Прафсаюзныя арганізацыі, у прыватнасьці саюз рабземлес, абсалютна нічога не зрабілі для разьвіцьця сьвінагадоўлі. У саўгасах «Сьвінатрэсту» зусім не разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва. Аб ударніцтве ідуць толькі гутаркі. Насьцендгазэты не закраналі гэтай вострай праблемы.

Вывад трэба зрабіць наступны — работа па разьвіцьці сьвінагадоўлі яшчэ не набыла ўдарных тэмпаў.

Л. Н.

Пазыка „Пяцігодка—за чатыры гады"

На заводах шырока разгортваецца падпіска на новую пазыку

Поўнае разьмяшчэньне аблігацый—лепшы адказ клясаваму ворагу і апартуністым

Бальшавіцкімі тэмпамі

БССР павінна заняць 1-е месца ў рэалізацыі новай пазыкі

«Пяцігодку—за чатыры гады». Гэты лёзунг, высунуты работчай клясай, пераўтвараецца ў жыцьцё пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі. Ажыцьцяўленьне гэтага лёзунгу ідзе побач з упартым змаганьнем рабочай клясы за выкананьне прамфінпляну, за зьніжэньне сабекошту прадукцыі, за ўзьлём прадукцыйнасьці працы, за сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі.

Ажыцьцяўленьне пяцігадовага пляну вялікіх работ за чатыры гады патрабуе таксама ўпартага змаганьня за выкананьне фінансавай часткі пляну. Ня гледзячы на вялікі ўзрост прыбытковых крыніц бюджэту, плян нашага сацыялістычнага будаўніцтва складзены з разьліку, што частка патрэбных сродкаў будзе атрымана ад працоўных мас у якасьці доўгатэрміновай пазыкі.

На жаль, нельга не адзначыць, што значная частка масавых пазык, якія рэалізаваліся дагэтуль, часта прадаваліся і закладваліся. Гэта парушала прынцып доўгатэрміновасьці крэдыту і перашкаджала ажыцьцяўленьню плянаў нашага будаўніцтва.

Рабочая кляса ацаніла значэньне доўгатэрміновасьці крэдыту і высунула пытаньне аб грамадзкім кантролі над аблігацыямі.

Урад Саюзу ССР спэцыяльнай пастановай устанавіў грамадзкі кантроль над аблігацыямі.

Працоўныя масы БССР праявілі прыклад вялікай пралетарскай сьвядомасьці, прынялі самы актыўны ўдзел у рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі. БССР заняла першае месца ў Саюзе адносна выкананьня кантрольных лічбаў пазыкі.

Аднак, трэба адзначыць, што некаторай менш сьвядомая частка працоўных была зусім слаба ахоплена 3-й пазыкай індустрыялізацыі. Пры значнай колькасьці рабочых і служачых, якія падпісаліся на суму звыш месячнага заработку, фонд заработнай платы па БССР быў ахоплены толькі на 79 проц. Гэта сьведчыць аб тым, што растлумачальная і агітацыйная работа была не на належнай вышыні, што грамадзкасьць, фінансавыя ўстановы не зьвярталі на гэту справу патрэбную ўвагу.

Задачай кампаніі па распаўсюджаньні пазыкі «пяцігодка за чатыры гады» зьяўляецца 100-процатны ахоп двухтыднёвага заработку рабочых, служачых, каапэраваных саматужнікаў, калгаснікаў і максымальны ахоп пазыкай сялян і нearганізаванага насельніцтва. Гэтая задача можа быць выканана толькі пры ўмове, калі нашы грамадзкія арганізацыі прымуць энэргічны ўдзел у кампаніі, калі рэалізацыя пазыкі ператворыцца ў вялікую палітычную кампанію за баявыя тэмпы, за фарсаваньне сацыялістычнага будаўніцтва.

Вялікую ролю ў кампаніі павінны адыграць сацыялістычныя спаборніцтвы паміж акругамі, раёнамі, прадпрыемствамі, цэхамі, калгасамі і вёскамі на поўны ахоп двухтыднёвага заработку працоўных. Трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на арганізацыю брыгад з рабочых і калгаснікаў для пасылкі іх па агітацыйную работу ў адстаючыя калгасы і вёскі. Трэба ўжываць мэтад «грамадзкага буксіру» ў адносінах да адстаючых прадпрыемстваў і цэхаў. Неабходна мець на ўвазе, што пры любым мэтадзе агітацыі не павінен ні ў якім разе парушацца прынцып добраахвотнасьці.

Праводзячы прынцып добраахвотнасьці, шэпы фінансавыя органы, крэдытныя ўстановы, камісіі садзейнасьці, прафсаюзныя арганізацыі не павінны спадзявацца на самацёк, а дабівацца пасьпяховых вынікаў шляхам вялікай растлумачальнай работы. Асабліва датычыць гэта работы сярод сэзонных і часовых рабочых, якія прымалі надзвычай слабы ўдзел у ранейшых пазыках.

Вялікую ўвагу трэба зьвярнуць на вёсну. Вёска прымала ўдзел у 3-й пазыцы у разьмеры 2—3 руб. у сярэднім на гаспадарку. Зразумела, што гэта лічба мізэрная. Трэба, каб кожны бядняк і серадняк, кожны калгаснік зразумеў, што патрэбны вялікія сродкі для сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, што разьвіцьцё прамысловасьці цесна зьвязана з разьвіцьцём не сырцовай базы—сельскай гаспадаркі.

Працэсы, якія адбыліся ў сельскай гаспадарцы, рост абагуленага сэктару, значнае павялічэньне прыбыткаў сялянства, складаюць усе неабходныя ўмовы для пасьпяховага выкананьня невялікіх для вёскі кантрольных лічбаў.

Нарэшце, трэба адзначыць, што вялікую работу прыдзецца правесьці для максымальнага захопу каапэраваных саматужнікаў і нearганізаванага насельніцтва.

Кампанія рэалізацыі тэхнічна ўскладняецца абменам аблігацый 1-й, 2-й пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі на аблігацыі новай пазыкі. Самы факт абмену паказвае, што дзяржава поўнасьцю выконвае свае абавязацельствы перад пазыкатрымальнікамі. Мэтай абмену зьяўляецца скарачэньне выдаткаў дзяржавы па тыражох і налажэньне працоўным магчымасьці сачыць за тыражамі.

Задача ўсіх партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый—энэргічнае разгортваньне кампаніі бальшавіцкімі тэмпамі.

БССР заняла першае месца ў Саюзе па рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

БССР павінна заняць першае месца ў Саюзе па выкананьні кантрольных лічбаў пазыкі «пяцігодка за чатыры гады». Кантрольная лічба—14,8 мільёнаў руб. павінна быць выкананы і перавыкананы. Гэтага патрабуе плян вялікіх работ, гэтага патрабуюць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Л. Бунін (пам. наркамфіна БССР.

УДАРНІКІ ПАДПІСНОЙ КАМПАНІІ

На ЗАВОДЗЕ «ЭНЭРГІЯ» праведзена папярэдняя падпіска на пазыку «Пяцігодку—за чатыры гады». За два дні падпіска дасягнула 17.500 руб., што складае прыблізна 33 проц. фонду двухтыднёвага заработку. 18 ліпеня ў часе абезэнага перапынку былі праведзены гутаркі па цэхах аб пазыцы.

КАЦЕЛЬНЫ ЦЭХ ПАСТАНАВІЎ СКОНЧЫЦЬ ПАДПІСКУ Ў ПРАЦЯГУ 2-х ДЗЁН; ЗА ГЭТЫЯ ДВА ДНІ АХАПІЦЬ 100 ПРОЦ. РАБОЧЫХ, ВЫКЛІКАЦЬ АДСТАЮЧЫХ, УЗЯЦЬ НА «БУКСІР» РАБОЧЫХ МЭХАНІЧНАГА ЦЭХУ.

Вечарам адбылася нарада прадстаўнікоў камісіі садзейнасьці пазыкі, заўкому, цэхавых камітэтаў і ўпоўнаважаных па цэхах па пытаньні пазыкі. Нарада абвясьціла сябе ўдарнай у правядзеньні гэтай кампаніі і прыняла выклік заводу «Бальшавік» і абутковай фабрыкі.

АЛЬТМАН.

Выклікаем на сацспаборніцтва друкарні „Зьвязда" і АВК

Падпіска на пазыку па друкарні БАН

На агульным сходзе рабочых друкарні Беларускай Акадэміі Навук абгаворвалася пытаньне аб падпісцы на пазыку «Пяцігодка за чатыры гады». Агульны сход аднадушна вітаў пачатак рэалізацыі пазыкі і выказаў поўную упэўненасьць, што ўсе рабочыя падпішуцца на двухтыднёвы заработак і бяз крайняй патрэбы ня будуць прадаваць і закладваць аблігацыі.

У рэзалюцыі сходу адзначана, што пазыкі зьяўляецца фінансавай базай пяцігодавага пляну і кожны, хто прадае аблігацыі без патрэбы падрывае шпаркія тэмпы індустрыялізацыі краю.

Агульны сход пастанавіў выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва па падпісцы друкарню выдавецтва «Зьвязда», друкарню АВК і мясцком БАН.

На другі-ж дзень пачалася падпіска. Усе 100 проц. рабочых (за выключэньнем адпускных) падпісаліся на двухтыднёвы заработак. Рабочы Энцін падпісаўся на 80 проц. месячнай заработнай платы.

БАНАВЕЦ.

Кампанію сустрэлі падрыхтаванымі

ПУХАВІЧЫ. (Наш кар.). Ужо два месяцы, як у Пухавіцкім раёне ідзе падрыхтоўка да рэалізацыі пазыкі. На ўсіх буйных вёсках, сельсаветах, ва ўстановах праведзены растлумачальныя сходы аб значэньні новай пазыкі. 6-га ліпеня была атрымана з акругі кантрольная лічба, 9-га ужо складзены плян разьмеркаваньня пазыкі сярод рабочых, служачых і сялян.

10-га ліпеня зацьверджан календарны плян рэалізацыі на пасяджэньні прэзыдыуму РВК і раённай камісіі садзейнасьці. Кантрольная лічба рэалізацыі ў раёне—70 тыс. руб. Сельскія камісіі садзейнасьці ўжо прыступілі да практычнай работы.

Р. ДРОЗД.

Хроніка рэалізацыі

На шэйнай фабрыцы «Кастрычнік» падпіска разгортваецца павольна—з тае прычыны, што фабрычныя арганізацыі не падрыхтаваліся да кампаніі. Пакуль што сабрана падпіска сярод 70 рабочых на 6.000 рублёў.

* * *

Супрацоўнікі крамы № 205 МІРК падпісаліся на двухтыднёвы заработак і выклікалі супрацоўнікаў крамы № 251 і цэнтральнага складу.

* * *

Прафдэлегаты крам 1-га групкому МІРК падпісаліся на двухтыднёвы заработак і выклікаюць усіх прафдэлегатаў іншых групкомаў.

Умовы выпуску новай пазыкі

Пазыка «Пяцігодка за чатыры гады» выпускаецца дзьвюма часткамі: адна на 500 мільёнаў руб., прызначаная для абмену ранейшых масавых пазык, другая—на 800 мільёнаў рублёў для рэалізацыі. Пазыка складаецца з двух выпускаў — процантна-выйгрышнага і бяспроцантна-выйгрышнага. Па процантна-выйгрышным выпуску трымальнік атрымлівае 6 проц. гадавых па купонах і 4,4% сумы ў якасьці выйгрышаў. Шансы на выйгрыш па бяспроцантна-

Будаўніцтва Асінаўскай электрастанцыі— на ўдарныя тэмпы

Да пуску 1-й раённай Беларускай электрастанцыі імя Сталіна засталося толькі каля 3-х месяцаў. Між тым, на будаўніцтве станцыі яшчэ і дагэтуль не ліквідаваны ряд недахопаў, на некаторых вучастках узяты недапушчальна павольныя тэмпы работы.

Возьмем, напрыклад, **механічнае абсталяваньне.** Змантаваны толькі адзін турбагенэратар на 10.000 клв. Другі турба-генэратар нельга змантаваць, бо няма падёмнага крану.

Для таго, каб падштурхнуць справу з кранам, на заводы накіроўвалася спэцыяльная ўдарная брыгада Сталінбуду, якая дабілася таго, што частка абсталяваньня для крану прыбыла, а іншыя часткі прыбудуць на працягу бліжэйшых тыдняў. Аднак, справа зрываецца з-за адсутнасьці матору для цялежкі, які павінен быў прыслаць і, ня прыслаў, Энэргабуд. Трэба неадкладна здабыць матор і пачаць мантаж другой турбіны, бо нельга дапусьціць працы адной турбіны бяз рэзэрву.

Зараз паконт **цеплавога абсталяваньня.** Добра ідзе мантаж катлоў, аднак, няма яшчэ параправодаў, якіх ня прыслалі з-за граніцы. У жніўні павінны прыбыць топкі. Дрэнна абстаяла справа з паветраправодамі, бо завод адмовіўся ад заказу. Толькі нядаўна заказ перададзены заводу «Энэргія», які абяцаў выканаць яго ў тэрмін.

Наконт **электраабсталяваньня** справа абстаіць наступным чынам. Чарапашым крокам ідзе мантаж электраабсталяваньня, бо Энэргабуд ня мае выстарчальнага ліку манцёраў, у зьвязку з чым работы вядуцца ў адну зьену.

Горш за ўсё праводзяцца ўнутраныя **будаўнічыя работы.** Тут не адчуваецца ніякага кіраўніцтва з боку Энэргабуду. Работы вядуцца павольна, не хапае будаўнічых рабочых.

Грамадзкім арганізацыям Сталінбуду трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на ўзмацненьне тэмпаў будаўнічых і мантажных работ. Трэба перайсьці на ўдарныя тэмпы работы і пусьціць станцыю раней тэрміну.

У гэтых мэтах бюро інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў і ўсе працаўнікі аддзелу забесьпячэньня Сталінбуду абвясьцілі сябе ўдарнікамі і ўзялі на сябе абавязак зьнішчыць усе дэфэкты, якія перашкаджаюць своячасоваму пуску станцыі.

Р.

Ліквідацыя акруговых спажывецкіх саюзаў

Учора пры Белкаапсаюзе адбылася нарада старшынь ЦРК, акрспажывецкіх саюзаў з удзелам прадстаўнікоў спажывецкіх таварыстваў. Нарада пастанавіла да 15-га жніўня скончыць рэарганізацыю сыстэмы спажывецкай каапэрацыі. Да 1-га верасьня павінна быць скончана ліквідацыя акруговых спажывецкіх саюзаў. Аддзелу кадраў запрапанавана зкласьці плян скарачэньня акруговых работнікаў, якія аслабяюцца ў зьвязку з ліквідацыяй акруговых спажывецкіх саюзаў. Вылучана адказная тройка для кіраўніцтва працай па рэарганізацыі сыстэмы.

КУРСЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ІЛЬНАЗАГАТОЎЦАЎ

З 1-га жніўня Белкаапсаюз адкрывае ў Менску курсы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы ільназагатоўцаў. Праз гэтыя курсы будзе прапушчана каля 80 чал.

ДАГЛЯД ЗА МАШЫНАМІ ПАВІНЕН БЫЦЬ ПАЛЕПШАНЫ

На дварэ **Ляднянскага** агракамбінату заўсёды валяюцца сельска-гаспадарчыя машыны, як жняваркі і інш. Ад дажджу гэтыя машыны заржавелі і зараз да работы амаль што не надаюцца.

Такое самае становішча і з трактарамі, якія часта псуюцца з тае прычыны, што адсутнічае за імі догляд.

Такім агідным адносінам да машын трэба палажыць канец.

П. Хр.

Прыезд кітайскіх камуністых

Учора ў Менск прыехала дэлегацыя кітайскіх камуністых, скончыўшых Міжнародную Ленінскую Школу.

Кітайскія таварышы прыехалі для вывучэньня будаўніцтва сацыялізму ў нацыянальнай рэспубліцы, яны наведаюць рад нацсаветаў, калгасаў і саўгасаў і буйнейшыя прадпрыемствы БССР.

Дэлегацыя наведае Гомель, Віцебск, Барысаў і Бабруйск і прыме актыўны ўдзел у правядзеньні дня 1-га жніўня.

Учора дэлегаты знаёміліся з будаўніцтвам універсытэцкага гарадка і мелі гутарку з рэктарам універсытэту т. Каранеўскім.

ГОРА-КААПЭРАТАР

Загадчык **Бароўскай** крамы, **Лельчыцкага раёну** (Мазыршчына) да наведвальнікаў адносіцца зусім дрэнна. Заўсёды лаецца з апошнімі і ніколі не адказвае на пытаньні пайшчыкаў.

Гэты-ж гора-каапэратар наводзіць паніку сярод насельніцтва з дробнымі грашыма, ніколі не дае рэшты, у той час, калі ў касе ляжаць дробныя. А ўсё гэта выкарыстоўваюць кулакі, нашы ворагі, — узмацняюць паніку, якую яны-ж узьнялі.

Такім работнікам не павінна быць месца ў каапэрацыйным апараце.

Зоркі.

ЦП саюзу саўгандальслужачых 20 ліпеня склікае 1-ю УСЕБЕЛАРУСКУЮ НАРАДУ РАБОЧЫХ-ВЫЛУЧЭНЦАЎ з наступным парадкам дня:

1. Папярэднія вынікі чысткі дзяржапарату (дакл. НК-РСІ і садаклад ЦП саюзу).
2. Выбары дэлегатаў на 1-ю Усесаюзную нараду вылучэнцаў.

Нарада адкрываецца 20 ліпеня а 7 гадз. веч. у памяшканьні клюбу саўгандальслужачых (рог Энгельса і Камуністычнай).

На адчыненьне запрашаюцца ўсе рабочыя-вылучэнцы, што працуюць у савецкіх, гаспадарчых установах, рабочыя і ФЗМК прадпрыемстваў, прафкамы саюзу і кіраўнікі адміністрацыйных, каапэрацыйна-гаспадарчых установ г. Менску.

Усім АПС і МК саюзу забясьпечыць своячасовую яўку дэлегатаў на нараду.

Новы Менск

Менск за апошнія 10 год са звычайнага губэрскага гораду ператварыўся ў буйны прамыслова-культурны цэнтр.

Хоць у Менску яшчэ шмат чаго няма але знадворны выгляд яго за пражытае намі дзесяцігоддзе значна зьмяніўся. Некаторыя раёны гораду, якія былі раней ваколіцамі, дзе панавалі пустакі і бязьлюдзьдзе, ператвараюцца ў новыя цэнтры сталіцы.

Да такіх месц трэба аднесьці перш за ўсё **Камароўку,** дзе акрамя маленькіх халупак з мізэрнымі закуткамі нічога ня было. Было, хіба, шмат камароў, чаму яна і носіць да гэтага часу сваю гучную назву. Быў, праўда, лес, які цяпер далёка адсунуўся, каб уступіць месца стадыёну, выстаўцы, клінічнаму гарадку.

Зараз на Камароўцы будуюцца клінічны гарадок, Акадэмія Навук, інтэрнаты палітэхнікуму і навукова-дасьледчы інстытут, які будзе распланаваны на месцы цяперашняй выстаўкі пасьля яе закрыцьця.

Усе пералічаныя навуковыя і культурныя інстытуты высунуліся некалькі далей ад самай Камароўкі: яны разьмясьціліся па так званым Барысаўскім тракце. На самай-же Камароўцы пашырыўся стары лесапільны завод Лесбелу за лік вялікай сушні і мэблёвага цэху, абсталяванага найноўшымі варштатамі

Да самай тэрыторыі выстаўкі даходзіць трамвайная лінія, якая сталёвай істужкай улеглася на новым бруку, скаваўшым камароўскае балота, у якім раней загрузалі людзі і коні. Уздоўж фрон ту выстаўкі намаганьнямі дартрансу пабудавана бэтанаваная дарога з абочынамі з клінкеру (моцна апалёная цэгла, пастаўленая на рабро).

Усё гэта—дасягненьні апошніх год ажыцьцяўленьня пяцігодкі.

Другая ваколіца гораду, якая таксама значна зьмяніла свой твар за апошнія несколько год—гэта **Ляхаўка.** Нядаўна тут было некалькі невялікіх прамысловых прадпрыемстваў: гарбарні і мэталёвыя майстэрні. З іх вырасьлі вялікая гарбарня «Бальшавік» з чырвонадубным, хромавым, жэлятынавым і інш. цэхамі і салідная лябараторыя, і мэталязавод **«Энэргія»,** які ў гэтым годзе абагаціўся добра абсталяванымі механічным і зборачным цэхамі.

За Ляхаўкай у полі вырас вялікі будынак **цукеркавай фабрыкі,** якая пакуль што стаіць неяк адарвана ад гораду. Яна, бязумоўна, неўзабаве зьвяжацца з Ляхаўкай пабудаванай дарогай. Там-жа за палатном чыгункі, паступова вырас рабочы пасёлак, ён, праўда, невялікіх разьмераў і не адзначаецца выгадамі ў сэнсе дабрабыту. Гэта протатып старое індывідуальнае дробнае будоўлі, ад якой мы зараз адмаўляемся, пераходзячы да сыстэмы дамоў-камун.

Упрывакзальным раёне за апошнія два гады нарадзілася **швэйная фабрыка «Кастрычнік»,** абсталяваная найноўшай установкай. Фабрыка пашыраецца і неўзабаве да яе далучаецца клюб і ясьлі.

Галоўная артэрыя гораду—Савецкая вуліца абагацілася карпусамі Універсытэцкага гарадка, будынкі якога занялі вялікі квартал, выходзячы на розныя вуліцы.

Азадобаю гораду павінен стаць **Дом Ураду,** які на сваім аб'ёме і вышыні больш за ўсе іншыя будынкі гораду.

У цэнтры гораду, на перакрыжаваньні Савецкай і Ленінскай вуліц, узьняўся **будынак Дзяржбанку**—самы арыгінальны дом у горадзе, але і самы дарагі. Ён блізкі да сканчэньня.

Адным з культурных дасягненьняў, бязумоўна, зьяўляецца **аўтаматычная тэлефонная станцыя,** якая зараз будуецца.

Клюбы мэталістых і харчавікоў працуюць ужо у новых добрых памяшканьнях. Зараз будуецца клюб будаўнікоў.

Нельга не ўспамянуць пабудову фабрыкі-кухні, 120-кватэрнага дому, 70-кватэрнага дому па Універсітэцкай вул., 75-кватэрнага па Камасмольскай, пабудова новай электрастанцыі і г. д. і г. д.

Усе гэтыя посьпехі дасягнуты намаганьнямі рабочае клясы, якая Беларусь —сярмяжны край балот і палёў—праўтарае ў край заводаў і калектыўных гаспадарак.

К-н.

Канфэрэнцыя слухачоў завочнага калгаснага універсытэту

Зараз адбываецца канфэрэнцыя слухачоў завочнага калгаснага універсытэту.

Мэта канфэрэнцыі—пашырыць і ўзмацніць сувязь паміж слухачамі-калгаснікамі і завочным універсытэтам, дапамагчы ім у штодзённай рабоце. Калгасны універсытэт працуе пры Беларускай с.-г. акадэміі, раней ён называўся сялянскім завочным універсытэтам.

На 1 ліпеня налічвалася 740 слухачоў-завочнікаў, з якіх 56 проц. калгаснікаў, 11 проц. членаў сельска-гаспадарчых арцеляй, рэшта індывідуальні-сераднякі і беднякі. З агульнага ліку слухачоў толькі 12 проц. жанчын. Праца універсытэту праводзілася шляхам рассылкі чарговых выпускаў кніг на грамадзка-палітычныя і сельска-гаспадарчыя тэмы, паводле навучальнага пляну. Да 1 ліпеня выйшлі 4 выпускі кніг, якія зьмяшчаюць каля 23 друкаваных аркушоў. Кнігі рассылаюцца завочнікам, ад якіх атрымліваюцца адказы на запытаньні па асобных артыкулах і справаздачы аб праведзеных занятках. Адказы і запытаньні перадаюцца для перагляду адпаведным спэцыялістам і адзначаюцца на картках кожнага слухача.

У канфэрэнцыі слухачоў прымае ўдзел каля 100 чал.

Канфэрэнцыя заслухае даклады аб сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, аб падрыхтоўцы кадраў для калгасаў, справаздачу завочнага калгаснага універсытэту, даклады аб мэханізацыі і хэмізацыі сельскай гаспадаркі і аб выніках дасьледчай работы ў калгасах.

З лістоў рабселькораў

ДА ЎБОРКІ ПАДРЫХТАВАНЫ

Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі па **Блонскім** сельсавеце (Пухавічы) распачалася своячасова.

Калгас **«Новая Зара»** і камуна **«Зьвязда»** канчаюць рамонт уборачных машын. У гэтых-жа калгасах арганізаваны дзьве ўдарныя брыгады па ўборцы ўраджаю. Для дапамогі чырвонаармейскім сем'ям, удовам, бясконным бядняцкім гаспадаркам, што не ўвайшлі ў калгасы, арганізавана пяць ударных брыгад з актыву членаў сельсавету, якіх налічваецца 24 чал.

Калгасы і індывідуальны сэктар прыступілі да ўборачнай кампаніі. Калгасам **«Новая Зара»** і камунай **«Зьвязда»** сабрана ўжо 17 гэкт. сенажаці, скошана 19 гэкт. канюшыны і заарана 124 гэкт. папару пад азімы клін.

ДРОЗД.

ХТО ЗА ГЭТА АДКАЖА?

Магілеўскі РВК пастановы СНК аб уборачнай кампаніі ня выканаў. Напрыклад, пляны пасеўнай і ўборачнай кампаніі, паводле пастановы, павінны былі быць даведзены да кожнага двара, да кожнага калгасу не пазьней 1-га ліпеня, а РВК яшчэ да гэтага часу не пераслаў плянаў у нізы.

Ёсьць і такія выпадкі, што ўборачныя машыны яшчэ не падрыхтаваны (**Дашкоўна**), а таксама адсутнічаюць склады.

Ш. А.

ШЭФЫ ДАПАМАГАЮЦЬ КАЛГАСАМ

Вясной 1930 г. **Янаўскі** вінзавод (Багушэвіч) узяў шэфства над **Стасэвіцкай** садовагародняй арцелью, Багушэўскага раёну. Увесь час гэтыя шэфы дапамагалі ў рабоце арцелі, а іменна: на сабраныя сродкі рабочых і служачых заводу калгасу закуплена сяварка, два хамуты, жнявярка і іншы сельска-гаспадарчы інвэнтар. Бухгальтэрыя заводу дапамагала наладжваньню рухунка-водзкай справы ў калгасе.

Зараз рабочыя вылучылі брыгаду для дапамогі ўборцы ўраджаю.

Дзякуючы дапамозе рабочых і дружнай рабоце калгаснікаў, уборка ўраджаю праходзіць з вялікім уздымам.

Селькор.

ПРАЦДАГАВОРНАЯ КАМПАНІЯ РАЗГОРТВАЕЦЦА ПАВОЛЬНА

Працдагаворная кампанія па **Круглянскім** раёне (Аршаншчына) праходзіць надзвычай марудна з тае прычыны, што РВК ніякіх дырэктыў сельсаветам аб удзеле ў рабоце гэтай кампаніі не даваў. Пры сельсаветах адсутнічаюць упоўнаважаныя па заключэньні дагавораў з сельска-гаспадарчымі рабочымі. Усяго ахоплена дагаворамі 6 гаспадарак (Загаранскі рабчком).

Цэлы рад дагавораў заключаны на кабальных умовах (Загаранскі і Лясьнянскі сельсаветы).

Круглянскі РК КП(б)Б павінен зьвярнуць асаблівую ўвагу на гэтую палітычную кампанію.

Грабштэйн.

БЕЗ КІРАЎНІЦТВА

Падрыхтоўка да перавыбараў чыгуначных мясцкомаў у **Гомельшчыне** праходзіць слаба. **Вучпрафсож** пасылае голыя дырэктывы, а практычна ў перавыбарчай кампаніі не дапамагае.

Самаправерачныя брыгады бязьдзейнічаюць, бо яны ўкамплектаваны казённа, не прымаючы пад увагу прынцыпу добраахвотнасьці.

Адстае ад гэтае кампаніі і друк, які не асьвятляе перавыбарчай работы.

Л. Ліўшыц.

Плян правядзеньня „Міжнароднага Чырвонага Дня 1-га жніўня"

Правядзеньне кампаніі Міжнароднага Чырвонага Дня ставіць перад усімі грамадзкімі арганізацыямі наступныя палітычныя задачы:

1. Давядзеньне да працоўных мас дасягненьняў і посьпехаў пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва СССР у сьвятле рашэньняў XVI зьезду ВсесКП(б) і мабілізацыя актыўнасьці мас на выкананьне прамфінплану, рэалізацыя пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады», калектывізацыя, хлебазагатоўчая кампанія, асеньняя сяўба, уборачная кампанія і інш.

2. Шырокае асьвятленьне працоўным масам гораду і вёскі небясьпекі імпэрыялістычнай вайны і асабліва небясьпекі контр-рэвалюцыйнай вайны супроць СССР з боку міжнароднага імпэрыялізму з завастрэньнем увагі на практычных задачах узмацненьня абароназдольнасьці нашага краю.

3. Шырокае растлумачэньне працоўным масам важнасьці і значэньня сацыялістычнага будаўніцтва СССР з пункту погляду задач сусьветнай рэвалюцыі і ролі інтэрнацыянальнай пралетарскай салідарнасьці ў абароне СССР ад ваенных авантур імпэрыялізму.

4. Шырокая папулярызацыя ў масах значэньня надыходзячага 10-гадовага юбілею Прафінтэрну і ролі Прафінтэрну ў сучаснай клясавай барацьбе.

Зыходзячы з гэтага, вызначыць наступныя мерапрыемствы па правядзеньні «Міжнароднага Чырвонага Дня»:

а) Усім цэнтральным, акруговым насьпецгазэтам і шматтыражкам неадкладна разгарнуць работу па падрыхтоўцы і правядзеньні кампаніі пад лёзунгам «рыхтуйцеся да Міжнароднага Чырвонага Дня»;

б) Ва ўсёй палітмасавай працы, якая будзе праводзіцца грамадзкімі арганізацыямі на працягу бліжэйшых тыдняў, асьвятляць задачы Міжнароднага Чырвонага Дня;

в) Мабілізаваць актыў усіх грамадзкіх арганізацый (прафсаюзу, МОПР'у, Асаавіяхіму, камсамолу, культзмычкі і г. д.) для пасьпяховага правядзеньня кампаніі як у горадзе, так і на вёсцы;

г) Правесьці масавую праверку і самаправерку дзейнасьці нізавых ячэек Асоавіяхіму ў галіне вялізацыі працоўных шляхам складаньня брыгад на фабрыках, заводах, установах, у дамах, саўгасах, калгасах;

д) У дзень 1 жніўня правесьці ў садох, клюбах, фабрыках, заводах, саўгасах, калгасах і вёсках масавыя мітынгі супроць падрыхтоўкі імпэрыялістычных войн і, у першую чаргу, супроць падрыхтоўкі ваеннага нападу на СССР з боку міжнароднага капіталізму.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

— **АД Мен. АКК КП(б)Б.** А 6 г. веч., 19 ліпеня на пасяджэньні парттройкі Мен. АКК КП(б)Б будуць разгледжаны справы наступных т. т.: Сінайскага Ш. Х. (зав. «Камінтэрн», Барысаў), Рубенчыка С. С. (яч. Наркамгандлю), Глікіна М. Г. (ЦП саюзу СГС), Лукашэвіча Ф. В. (Сьмілавіцк. р-н), Гэўта Т. А. (яч. ЦКК НК-РСІ), Табачніка Я. Я. і Гольдбэрга С. (яч. ВСНГБ), Гардона М. Х. (Белкаапсаюз), Трахцэнбэрга М. А. (Чэрвенск. р-н), Уэльскага Д. С. (Койданаўск. р-н), Шымука П. З. і Кабака С. В. (Плешчаніцк. р-н), Шорнікава В. (№-скі кав полк), Землякова Т. Б. (яч. мал. рам.), Сакевіча Д. Я. (яч. дэпо), Гуліса А. А. (яч. ЦПП), Юховіча Л. Я. (зав. «Камунар»), Каралёва Я. К. (яч. міліцыі), Засімчука С. Д. (зав. «Энэргія»), Койданоўскага (заг. 6 сталоўкі) і Шульмана М. А. (яч. ваг. майстэрань).

— **Мен. АК КП(б)Б.** А 7 г. веч., у памяшк. АК адбудзецца нарада партупоўнаважаных па «Правдзе» з наступным парадкам дня:

1) **Вынікі сацспаборніцтва па павялічэньні тыражу «Правды».**

2) **Вынікі паўгадовай падпіскі на «Правду» і інш. справы.**

Яўка для партупоўнаважаных абавязкова.

— **ЦП саюзу сельгаслесрабочых.** А 6 гадз. веч., у клюбе Дому Селяніна адбудзецца **агульны сход членаў саюзу сельгаслесрабочых,** якія знаходзяцца на вучоце Менгарбачкому. У парадку дня: **перавыбары гарбачкому.** Яўка абавязкова.

— **Кастрыч. РК КП(б)Б.** А 7 г. веч., у клюбе Леніна (ст. Менск.-пас) склікаецца нарада **гаспадарча-вытворчых сэктароў ячэек і гаспадарнікаў — партыйцаў.** У парадку дня:

1. Вынікі праверкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва па раёне.

Прадстаўнікі памянёных сэктароў і гаспадарнікі — партыйцы павінны зьявіцца ў абавязковым парадку.

ЗАЎТРА

— **Кастрычн. РК МОПР'у.** А 7 г. веч. адбудзецца нарада членаў Кастрычн. РК МОПР'у. Яўка абавязкова.

— **Рэсп. бюро АРУ.** А 7 г. веч., у памяшк. АРУ (Савецкая,65) адбудз. пасяджэньне прэзыдыуму сумесна з актывам АРУ.

— **Аб'яд. бюро скаргаў НК-РСІ.** А 7 гадз. веч., у памяш. аб'яднанага бюро скаргаў НК-РСІ склікаецца нарада рабочых-засядацеляў пры бюро скаргаў. У парадку дня:

1. **Аб надыходзячай справаздачна-перавыбарчай кампаніі рабочых-засядацеляй.**

Ячэйкі КП(б)Б і ФЗМК, калі гэтыя т. т. будуць заняты на грамадзкай працы павінны іх аслабаніць.

— **Парттройка ЦКК КП(б)Б** паведамляе, што 20 ліпеня а 18 з пал. гадз. будуць разглядацца справы наступных т. т.: Гарэліка Б. М., Левіна С. Х., Хрысанфава Я. Х., Гурвіча М. С., Хітрана Г. М., Барысэвіча Ю. В., Цэйкліна Б., Кантаровіча С. С., Згурскага П. М., Гурскага А. Я., Зэвіна І. І., Кантаровіча С. П., Каждана Т. Г., Варанкова В. Я., Салавея Л. Г., Гусаіма А. І. і Коняка А. Л.

Памянёныя т. т. запрашаюцца для прыняцьця ўдзелу пры разглядзе справ. Праезд за ўласны кошт. Таксама запрашаюцца прысутнічаць старшыні праверкомаў і сакратары ячэек.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

— **Кастрычн. РК МОПР'у.** А 7 г. веч. адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму Кастрычн. РК МОПР'у. Прысутнасьць членаў прэзыдыуму абавязкова.

Час. вып. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.

Кіно-тэатр „Культура"
Бытавая драма ў 8 частках
ГІЛЯНАВА ДАЧКА
— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ —
апошняе дасягненьне тэхнікі Пудоўныя цені
Для ўспрыняцьця эфэкту „Цудоўныя цені", можны глядач атрымлівае спэцыяльныя акуляры ў касе кіно-тэатру за плату 7 к.
Пачатак сэансаў: 7 г. 30 м., 9 і 10 г. 30 м.

КІНО Інтэрнацыянал
СЁНЬНЯ ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
экстраны выпуск КІНО-ХРОНІКІ алімпіяда мастацтваў
На экране мастацкі фільм вытворчасьці Дзяржкінпром-Грузіі
ЭЛІСО
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 м.
Каса—ад 5 г. 30 м.

КІНО Пралетары
СЁНЬНЯ ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
экстраны выпуск КІНО-ХРОНІКІ алімпіяда мастацтваў
На экране: новая выключная амэрыканская камэдыя
Шумныя суседзі
(з-за спадчыны)
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 м.
Каса—з 5 г. 30 м.

КІНО-САД
Выключна мастацкі фільм з гішпанскага жыцьця
ДОНА ЖУАНА
ў 9 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 10 гадз.
Каса адкрыта з 6 гадз.

Заходняя Абласная Кантора Машынааб'яднаньня
Аддзяленьне Акц. Т-ва „Металлосклад"
ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ
СПАЖЫЎЦОЎ і ПАСТАЎШЧЫКОЎ МАШЫНААБ'ЯДНАНЬНЯ
аб тым, што з 16-га ліпеня 1930 г. АПЭРАЦЫЙНЫЯ ФУНКЦЫІ па нявыкананых у 1929-30 годзе Заходняй Абл. К-рай Машынаб'яднаньня дагаворах і зьдзелках, за выключэньнем тэргоў і каапэрацыі, па ніжэйпаказанай продукцыі:
а) па інструманту рознаму, б) на арматуры, в) на падёмных мэханізмах, г) насосах, д) вэнтылятарах, і е) на дробным машынным абсталяваньні
пераходзяць да Заходняга Аддзяленьня Акцыянэрнага Таварыства „Металлосклада",
Да якога належыць зварочвацца з усімі запытаньнямі і спраўкамі, якія датычацца сканчэньня выкананьня абавязацельстваў Заходняй Абласной Канторы Машынааб'яднаньня па вышэйпаказанай прадукцыі ў Менскі філіял „Металлосклада" па адрасе:
Ст. Менск, Таварная МБЦ чыг.
(тэл. № 26 і № 16, Таварн. МБЦ чыг.).
Заходняя Абласная Кантора Машынааб'яднаньня.
Заходняе Абласное Аддзяленьне Акц. Т-ва «Металлосклад»

Украдзена 15 ліпеня г.г. гэрбовая ПЯЧАТКА
Пуньку ПВО г. Меяску, ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНАЙ

ПРАДАЕЦЦА жаночы ня новы ВЕЛЕСЫПЭД
Новая-Камароўка, 9, к. 2.
Бачыць да 5 гадз. дня.

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" званеце па тэл. 7-81

У зьвязку з 1-й Усебеларускай Выстаўкай сельскай гаспадаркі і прамысловасьці
арганізуецца адначасова
ВЫСТАЎКА
„ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА БССР за 10 год"
(карціны, графіка, скульптура, архітэктура, самадзейнае мастацтва).
Галоўмастацтва НКА БССР і выставачны камітэт гэтай выстаўкі просіць адпаведныя арганізацыі, якія маюць мастацкія творы, а таксама паасобных мастакоў і грамадзян дапамагчы ў арганізацыі выстаўкі: даць весткі аб гэтых творах і надаслаць іх у адрас БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА МУЗЭЮ (Цэнтральны Дом Селяніна, тэл. 3-83).
Экспаваты прымаюцца ў музэі з 12 да 2 гадз. дня тав. Вержбіцкім.
Пажадана, каб пасылаемыя творы або адбівалі будаўніцтва БССР за апошняе 10-годзьдзе, або найбольш характарызавалі б творчы твар мастака. Будаўнічыя і будоўчыя арганізацыі БССР і паасобныя архітэктары і будаўнікі могуць адаваць свае экспанаты таксама і члену выстаўкому—архітэктару ЛАУРОВУ (Наркамасьветы, Пляц Волі, 2-гі паверх, пакой № 13).
Апошні тэрмін здачы або прысылкі экспанатаў 5-га жніўня.
ГАЛОЎМАСТАЦТВА НКА БССР.
КАМІТЭТ ВЫСТАЎКІ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА БССР за 10 год.

КІНО „СПАРТАК"
3 панядзелка, 14 ліпеня
З прычыны вялікага посьпеху
2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі ТЫДЗЕНЬ
Нашумеўшы фільм
АЛІМ
драма ў 10 частках.
Пачатак сэансаў: 7 г., 9 г. і 11 г.
Каса—ад 6 гадз.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ
ў Скрыгалаўскую прафшколу
гідратэхнікаў і культуртэхнікаў
на 1930-31 навучальны год
1. У прафшколу прымаюцца асобы ад 14 да 18 год, якія скончылі (незалежна ад году сканчэньня) поўны курс 9-годкі, 2 ступені, 2-гадовых адукацыйных курсаў, 7-годкі, школы для дарослых павышанага тыпу, школы сялянскай моладзі, прафшколы на базе 4-годкі, пасьля 3-х год вытворчага стажу, і курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікумы.
УВАГА: вытрымаўшыя іспыты ў 1928-29, 1929-30 г. г. пры паступленьні аслабяюцца ад іспытаў.
Прыём заяў пачынаецца
з 15-га ліпеня па 1-га жніўня г. г.
2. Дакументы прыкладаюцца ў аўтографах, за выключэньнем вайсковых: а) дакумант аб узросьце (мэтрыка), б) аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын), в) аб асьвеце, г) дзве фатаграф.-карткі, д) мэдычнае пасьведчаньне аб стане здароўя, е) дакумант аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў пасьля рэвалюцыі і да рэвалюцыі, ж) даведка аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых правоў, з) для сялян—акладны ліст на 1929-30 год, а для саматужнікаў—патэнт, і) анкету, пасьведчаную прафэсіянальнымі або савецкімі арганізацыямі, к) паштовых марак на адказ на 30 кап.
3. Тэрмін іспытаў і залічэньня ўстанаўліваецца з 1-га па 10 жніўня г. г.
Пачатак заняткаў з 1-га кастрычніка.
Заявы накіроўваць па адрасе: Скрыгалаў, Мазырскае акругі, Прафшкола
ПРАФШКОЛА.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ ВЫХОДЗІЦЬ З ДРУКУ
КУРС КАМЭРЦЫЙНЫХ ВЫЛІЧЭНЬНЯЎ
В. Т. Вайтэнка
дапаможнік для ВНУ, бухг. курсаў, техн. і спэцкласаў.
ЦАНА 2 руб. 50 кап.
Заказы і грошы накіроўваць па адрасе: Менск, пошта, скрынка 44

Заводу „БЕЛАРУСЬ",
МЕНСК, Старажоўская, 44,
ПАТРАБУЕЦЦА
ст. БУХГАЛЬТАР
з вытворч.-гандл. стажам.
АКЛАД ПА ЗГОДЗЕ

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ — ГАРАДЗКОГА ЎЗАЕМДАПАМОГІ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл
АДКРЫТА ад 9 гадз. рэн. да 9 г. веч.
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
на ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і нварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хэміка-бактэрыялягічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. веч. штодзённа
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дзяжурныя дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз. раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэт Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную дыфэрэнцыаваную плату.

ВЫШАЎ З ДРУКУ, рассылаецца падпісчыкам і паступіў у продаж
„ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК"
ОРГАН ЦК КП(б)Б
№ 9-10 за ЛІПЕНЬ месяц № 9-10
ЗЬМЕСТ:
„ПЕРАДАВАЯ.—Па шляху Леніна.
Партыйнае будаўніцтва.
ПАРТЫЕЦ.—Хутчэй перабудаваўца.
Г. ШПЭКТАРАЎ.—Аб выніках перавыбараў нізавых парторгаваў і некаторых чарговых задачах.
За калектывізацыю.
М.—Рыхтавацца да ўборкі ўраджаю.
ПРАКОПЧЫК.—Выпраўдзеньне памылак і тэмпы калектывізацыі
БУРАВА.—Масавая работа сярод сялянак.
М. ЛАБАДАЕЎ.—Аб рабоце з вясковай бедняцтвам.
На асобных вучастках работы.
ДУНЕЦ.—Правы ўхіл і «левы» загіб у яўрабоце.
САЛДАЦЕНКА.—Нататкі з жыцьця калгасных і вясковых ячэек.
Агітацыя і прапаганда.
В. ШЧАРБАКОЎ.—Кіраўніцтва работай у галіне народнай асьветы і агульна-культурнага будаўніцтва.
Партыйная вучоба.
Мэтадычныя распрацоўкі. (Для кіраўнікоў палітграматы і прадметных турткоў на выніках XIII зьезду КП(б)Б).
Прыкладныя вучэбныя планы. (Для курсаў перападрыхтоўкі партактыву).
Бібліяграфія.
Кошт асобнага нумару 25 кап.
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
На 1 м-ц —25 кап. | На 6 м-цаў—1 р. 50 кап.
„ 3 м-цы—75 кап. | „ 1 год—2 р. 25 кап.
Кожная гарадзкая і вясковая партыйная і камсамольская ячэйка, кожны агітатар, прапагандысты, пахавы, групавы і зьвяньневы арганізатар, кожны партыйны актывісты павінен падпісацца на часопіс «ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК».
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: Галоўнай Канторай газэты „ЗЬВЯЗДА" (МЕНСК, Савецкая, 63), усімі паштовымі канторамі, лістаносцамі і спэцыяльнымі ўпоўнаважанымі.

Беларускае дзяржаўнае выдавецтва
ВЫШЛІ з ДРУКУ і паступілі ў продаж ва ўсіх кнігарнях БДВ і спажыўкаапэрацыі:
АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ.—ГУДКІ. Стар. 36. Цана 20 к.
Міхась ЗАРЭЦКІ. — РАКАВЫЯ ЖАРОНЦЫ. Стар. 260. Цана 1 р. 80 к.
Зьм. ФУРМАНАЎ.—МІХАЛ ВАСІЛЬЕВІЧ ФРУНЗЭ. Стар. 46. Цана 15 к.
Янка КУПАЛА.—ЗБОР ТВОРАЎ, т. II. Стар. 429. Цана 3 р.
СУПРОЦЬ АНТЫСЭМІТЫЗМУ. Стар. 100. Цана 40 к.
Мастацкае слова масам
А. СЕРАФІМОВІЧ.—СОПКА З КРЫЖАМІ. Стар. 80. Цана 20 к.
Тэатральная бібліятэка
І. ВЯРХОЎЦАЎ.—ГАЗАВЫ СПЭЦ. Стар. 35. Цана 18 к.
Бібліятэка школьніка
С. ГРЫГОР'ЕЎ.—СЫГНАЛЫ ВЯЛІКАНАЎ. Стар. 76. Цана 30 к.

ЗАОЧНЫЕ ГОСКУРСЫ РОСПИСИ (РАЗРИСОВКИ). Роспись по всевозможным тканям: мягким золот., серебр., шелкам, рельефи анилин. не расплыв. красками.